# Эўрыка

гісторыя
адкрыцці
знаходкі
парады
















# Эўрыка*

гісторыя
адкрыцці
знаходкі
парады

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
2002

УДК 087.5:082
ББК 72
Э 94

Серыя заснавана ў 1998 годзе

Укладальнік Н. В. Філіповіч

*Для сярэдняга школьнага ўзросту*

ISBN 985-02-0582-2

© Філіповіч Н. В., укладанне, 2002
© Кудзіна Т. Я., Мякінка Н. М., Рыжы М. Р., Свентахоўскі У. П., ілюстрацыі, 2002
© Афармленне. ВРУП "Мастацкая літаратура", 2002

# 1

# Старонкі гісторыі



*Анатоль БУТЭВІЧ, пісьменнік*

# СЛАВА І НЯСЛАЎЕ КРЭЎСКАГА ЗАМКА

Што мне пекны Парыж, Рым прыгожы і слынны,
Што швейцарскія горы, старыя Афіны.
Што мне Вена, што мне Лондан туманны…
Больш за ўсё я бацькоўскаму краю адданы.

*В. Дунін-Марцінкевіч*

## З ЗАМКАЎ ПАЧЫНАЛІСЯ ГАРАДЫ

Замкі Беларусі… Гэта сапраўды неацэнны культурны і гістарычны нацыянальны скарб. Шмат слаўных і трагічных старонак нашай гісторыі звязана з імі. Калі б не замкі, не мужнасць, адвага і самаахвярнасць іхніх абаронцаў, то мо не было б сёння і беларускай зямлі. Яшчэ і дагэтуль старадаўнія абарончыя комплексы здзіўляюць сваёй магутнасцю, паважнасцю, велічнасцю. Нават іхнія руіны сведчаць пра былую моц, нават замчышчы ўражваюць сваёй непрыступнасцю. І ўсе гэтыя гняздоўі беларускай славы ахінуты намёткай таямнічасці, атулены шматлікімі легендамі і паданнямі. Без іх і сама гісторыя была б сухой і невыразнай, а яе ўспрыманне — без належнага даўніне рамантычнага арэола. Вось каб удалося расхінуць заслону часу і прачытаць усе таямніцы, выслухаць споведзі ўсіх замкавых прыві-

даў — наколькі ажыла б і зарунела наша гісторыя, якой захаплляльнай і непаўторназваблівай стала б яна. Не горай, чым у даўно і звыкла прызнаных еўрапейскіх майстроў гістарычна-дэтэктыўнага жанру.

Кажуць, што Беларусь зверху нагадвае карункавы кляновы лісток. Калі б выпала шчаслівая магчымасць узняцца над гэтым лістком, шмат цікавага маглі б мы ўбачыць. Заўважылі б, што, як пульсуючымі жылкамі, ён пранізаны рэчкамі, рэкамі, рачулкамі, ручаямі. А калі б нейкі чараўнік здолеў у адначассе аднавіць усе беларускія замкі, што некалі “грозна, думна” азіралі наваколле, нашаму здзіўленню не было б межаў. Як пагодлівым жніўнем бары густа засяляюцца ляснымі каралямі-баравікамі, так і нашая зямелька спрэс прарасла б цудоўнымі архітэктурнымі ансамблямі.

Замак і замок. На першы погляд паміж гэтымі словамі няма ні прамой сувязі, ні ўзаемазалежнасці. Аднак, калі супаставіць глыбінны сэнс абодвух слоў у гістарычнай праекцыі, можна зразумець іхнюю роднаснасць і паяднанасць. Па самай першаснай сваёй сутнасці замкі выступалі сапраўднымі ахоўнікамі беларускай зямлі. Кожны з іх уяўляў надзейны, з індывідуальным сакрэтам замок, які перакрываў шлях ахвотнікам заваяваць нашыя палеткі, лясы, бары, балоты і рэкі, зняволіць нашых людзей.

Нездарма некалі існавала завядзёнка, згодна з якой зямля, няхай сабе па ёй топчуцца заваёўнікі, не лічылася захопленай, пакуль не зломлена супраціўленне замка, пакуль там жывуць і абараняюцца гаспадары. Таму і доўжыліся аблогі замкаў тыдні, месяцы, а то і яшчэ болей.

А беларуская зямля знаходзілася ж на ажыўленым еўрапейскім скрыжаванні. Таму была яна зваблівай як для іншаземных захопнікаў, так і для суседніх князёў і валада-

роў. Практычна ніколі не прыпыняліся тут ні баявыя дзеянні, ні спробы завалодаць гэтым краем шляхам подкупу, падману, інтрыг і хітрыкаў. Рознае бывала на шматвяковым пакручастым шляху беларускай гісторыі. Але чым больш нашы продкі супраціўляліся захопніцкім памкненням дужых, моцных і проста авантурных заваёўнікаў, тым больш, здаецца, ліплі яны. Тым больш жорсткай была расправа з няскоранымі, працавітымі, вольналюбівымі і прыветнымі тутэйшымі людзьмі.

У выніку беларусы скрозь і заўсёды мусілі ўзводзіць абарончыя збудаванні. Каб надзейна абараніць сябе і сваю будучыню. Ці не таму здавён павялося, што кожны беларускі горад, кожнае значнае паселішча пачыналася з узвядзення замка. Пасля ўжо вакол яго пачыналася актыўнае і размаітае жыццё. Беларускія замкі, асабліва больш позняга часу, — гэта не нешта невыразнае, аднастайнае, змрочна насупленае. Гэта выдатныя архітэктурныя збудаванні, сапраўдныя ўзоры нацыянальнага ваеннага дойлідства. І служылі яны не толькі для абароны. Там жылі іхнія гаспадары, там развіваліся і ствараліся культурна-бытавыя традыцыі, там збіраліся і захоўваліся гістарычныя памяткі, духоўныя і матэрыяльныя скарбы. І гэта, безумоўна, накладвала адбітак на ўвесь уклад замкавага побыту. Такая іхняя своеасаблівасць і адметнасць з максімальнай паўнатой улічвалася пры праектаванні і ўзвядзенні.

Беларускія замкі, як і аналагічныя збудаванні ў іншых краінах, прайшлі працяглы шлях развіцця. Узніклі яны як умацаванае жыллё феадалаў. Часта пачыналі з галоўнай вежы — данжона, вакол якой і бруілася далейшае жыццё. Для абароны самой вежы насыпа́лі высокі земляны вал, капалі роў, узводзілі магутныя сцены. Так узнікаў той замак, да якога мы сёння прызвычаіліся. На самым

далёкім пачатку замкі былі занадта ваяўнічыя, суровыя, нават панурыя. А ўжо з XII стагоддзя знешні выгляд набывае большую вабнасць, нібы дабрэе іхні характар, планіроўка становіцца больш свабоднай. У XIII – XIV стагоддзях замкі нагадваюць цэлыя комплексы пабудоў. Яны выконваюць і іншыя — цывільныя, прадстаўнічыя функцыі. Аж пакуль нарэшце не ператвараюцца ў шыкоўныя і велічныя, багата аздобленыя палацавыя ансамблі. Унутры замкавай прасторы сталі будаваць жылыя і гаспадарчыя памяшканні, цэрквы, студні, ставы, узводзілі стайні, катоўні, вязніцы.



У замкавых турмах адбывалі пакаранне не толькі прасталюдзіны. Сюды траплялі і асобы высокіх званняў і пасад. Рассылалі вязняў па замках у залежнасці ад іхняй правіны, суровасці пакарання і ўмоў утрымання. Вось што, напрыклад, згадвае ў сваім Дыярыушы віленскі ваявода, гетман Вялікага княства Літоў-

скага князь Міхал Казімір Радзівіл. У жніўні 1749 года ён спыніўся ў Нясвіжы. А 6 жніўня "па абедзе судзіў суды гетманскія і асудзіў п. Касіцкага... і п. Пласкоўскага... Першаму — на замку Трокскім, другому — на замку Наваградскім, кожнаму па 6 тыдняў сядзець; пачтовых двох, аднаго непрысутнага, другога прысутнага Андрэя Савечынскага на расстралянне, дзевяцёх жа на сядзенне асудзіў у ланцугох у замку Мірскім, па колькідзесят тыдняў". I звестак такіх па летапісах, у даўніх архіўных справах і мемуарнай літаратуры рассыпана процьма.

З XVI стагоддзя змяняецца планіроўка самiх беларускіх гарадоў. Ранейшы дзядзінец, якім даўней пазначалі ўмацаваную частку горада, пачынае ператварацца ў крэпасць альбо замак. Гэтую асабліва важную тэрыторыю называлі местам, а ўсе астатнія забудовы, што ўваходзілі ў абаронную зону, — прадмесцямі. Згадайма хоць бы Траецкае прадмесце ў Менску. Прадмесце называлася яшчэ пасадам, які ў буйных гарадах мог мець некалькі зон. Аднак усё адно знаходзіўся ён за замкавымі сценамі альбо вакол умацаванага дзядзінца. Асобныя зоны пасада напачатку мелі назву канца — як, напрыклад, Пятніцкі канец у Менску, які стаў пасля Татарскім канцом, а яшчэ пазней — Татарскім прадмесцем. Ды ўсё ж у любым горадзе галоўную ролю адыгрывала ўмацаваная і абароненая частка — крэпасць альбо замак.

### ЗАМКАВАЯ МОЦ

Безумоўна, замак выконваў найперш абарончую функцыю. Таму заўсёдную неаслабную ўвагу надавалі ягонай моцы і непрыступнасці. Акрамя высокіх вежаў майстравалі таемныя лесвіцы, выхады, падземныя лёхі-тунелі, байніцы і парахавыя паграбы, умацоўвалі артылерыяй і іншай сучаснай на той момант зброяй. Назапашвалі боезапас — сма-

лу, камяні-валуны. Асаблівую ўвагу звярталі на ўваход у замак, які, як правіла, быў адзіным. Яго ахоўвалі моцныя падвойныя дубовыя дзверы на завалах. Пасля прыдумалі рашоткі-герсы з завостранымі ўнізе жалезнымі палосамі. Яны да пары да часу хаваліся высока ўгары, а ў выпадку раптоўнай небяспекі надзейна блакіравалі ўваход у замак, імгненна па́даючы зверху. Узводзілі пляцоўкі для назірання і спецыяльныя навясныя байніцы — машыкулі, "варавыя вокны", адкуль на ворагаў лілася гарачая смала і падалі важкія камяні.

Сярод старадаўніх магутных абаронцаў беларускай зямлі адным з першых лічыўся і Крэўскі замак. Сёння ад яго засталіся толькі руіны. Але без гэтага замка нельга ўявіць летапіс не толькі тутэйшых мясцін, але і Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай. Як дзейсны ўдзельнік гісторыі, замак прысутнічае ў шмат якіх дакументах, з ім цесна знітаваны лёс многіх выдатных асоб і тагачасных дзяржаўных дзеячаў. Так было наканавана, што ў крэўскіх мурах спеліліся і запачаткоўваліся важнейшыя, часам лёсавызначальныя падзеі для ўсёй Еўропы. Крэўскі замак стаў сімвалам магутнасці і дзяржаўнай моцы велікакняскіх уладароў. У ім станавілася на крыло наша гісторыя.

Калі б старадаўнія муры раптам набылі здольнасць гаварыць, колькі неверагоднага і непаўторна цікавага, займальнага і нават жудасна-страшнага даведаліся б мы сёння. За сваё размаітае амаль 700-гадовае жыццё Крэўскі замак зведаў славу і няслаўе, шум вялікіх бяседаў і галас ведзьміных шабасаў, разбурэнне і аднаўленне, багацце і заняпад, візіты знаных гасцей і дзяржаўных асоб. Для добрых людзей ён праяўляў шчырую і шчодрую гасціннасць, а для ворагаў станавіўся непрыступнай крэпасцю. Давялося замку быць сведкам непамысных злачынстваў. Дарэчы, кожны бела-

рускі замак меў падобны лёс. А іхняя таямнічасць, загадкавасць звязаны, магчыма, з тым, што просты люд не меў свабоднага доступу не толькі ў княскія пакоі, але і ў вежы, за пад'ёмныя масты і дубовыя вароты. Таму дамалёўваў замкавы побыт на свой лад. А мо проста ўсе беды і нястачы абяздоленых сялян і месцічаў, якія мусілі сваёй працай узводзіць і ўтрымліваць замкі, звязваліся з бязмежным багаццем князёў і баяр, поўнаўладных гаспадароў не толькі шыкоўных палацаў, а і тутэйшых зямель з усімі іхнімі насельнікамі.

Замкі будавалі ў такіх месцах, якія сама прырода мусіла абараняць ад ворага. Высокая гара, як у Лідскім замку. Сутокі рэк Няміга і Свіслач і вялікае балота на подступах, як у Мінску. Узвышанае месца і рака, як у Крэве. Там, дзе надзейнай прыроднай спрыяльнасці не ставала, выручалі магутныя сцены і высокія вежы, як у Мірскім замку. Часта ахоўную функцыю выконвалі штучныя ўмацаванні: земляныя валы, вадзяныя равы, як ля Нясвіжскага замка. А сам Радзівілаўскі замак быў абкружаны цэлай сістэмай азёр, цераз якія вяла толькі вузкая грэбля. У выпадку неабходнасці яе можна было хутка разбурыць, надаўшы замку астраўны характар. Многія абарончыя збудаванні дзеля большай непрыступнасці ўдала спалучалі і прыродныя ўмовы, і штучныя ўмацаванні. У самыя-самыя далёкія часы замкі былі драўляныя. Пазней іх будавалі з камення і цэглы, а старыя, драўляныя, перараблялі, умацоўвалі, дадавалі ім моцы і непрыступнасці. Альбо проста пакідалі.

Для пабудовы Крэўскага замка выбралі забалочаную нізіну наўзбоч высокага пагорка, дзе зліваліся рэчкі Крэўка і Шляхцянка. Узводзілі яго замест ранейшага, драўлянага, які знаходзіўся на даўнім гарадзішчы. Каб засцерагчыся ад вады, спецыяльна насыпалі пясчаную выдму. А фундамент



заглыбілі ажно на 3 метры. Да таго ж паклалі яго на спецыяльныя падушкі з камення і гліны, з дубовых і яловых жэрдак і галін. Гэта рабілася дзеля таго, каб надзейна стаялі высокія і тоўстыя сцены. Каб не ўрасталі ў зямлю яшчэ вышэйшыя вежы. А дасціпныя людзі пасмейваліся, што на гэткіх падушках не будзе мулка не толькі магутнаму замку, а і ягоным гаспадарам.

Будоўля вялася на заходняй ускраіне вёскі Крэва. Дакладная дата пачатку будаўнічых работ засталася невядомай. Па меркаванні гісторыкаў, гэта было ў 30-я гады XIV стагоддзя. Тады на нашых землях набірала моцы Вялікае княства Літоўскае. Створана яно было ў 1240-я гады з цэнтрам у Новагародку. Для аховы гэтай дзяржавы і патрэбны былі магутныя і надзейныя абарончыя збудаванні. Узводзіў Крэўскі замак адзін з сямі сыноў Гедыміна – будучы вялікі князь Альгерд. Вялікія князі ўзначальвалі тады дзяржаву, лічыліся першымі асобамі ў Княстве. Гедымін быў знаным і слаўным князем. Ён стаў пачынальнікам вялікага і магутнага роду Гедымінавічаў, з якім працяглы час быў звязаны лёс беларускіх земляў у складзе Вялікага княства Літоўскага. У 1323 годзе Гедымін перанёс сталіцу Княства ў Вільню.

## СТВАРАЛЬНЫЯ ПАМКНЕННІ АЛЬГЕРДА

Віцебскі князь Альгерд атрымаў Крэўскі замак у 1338 годзе, калі вялікі князь Гедымін падзяліў свае землі паміж сынамі. Некаторыя гісторыкі прыпісваюць Альгерду будаўніцтва замкаў у Вільні, Троках, Медніках, Крэве, Лідзе і іншых гарадах Княства. Ды, верагодна, з ягоным імем звязаны найперш Крэўскі замак. Тут Альгерд жыў з 1338 да 1345 года. Аднак яму не давалі спакою лаўры першага чалавека ў дзяржаве. Калі ў 1341 годзе Гедымін загінуў у

бітве з крыжакамі, вялікім князем стаў адзін з яго сыноў — Яўнут. Ды не спадабалася гэта Кейстуту і Альгерду. На гэтай аснове яны зблізіліся і наважыліся адабраць велікакняскі пасад. У выніку вайсковага выступу супраць Яўнута вялікім князем літоўскім у 1345 годзе стаў Альгерд. Кейстут высакародна саступіў яму высокі пасад як старэйшаму брату і свайму надзейнаму паплечніку. У сувязі з гэтым Альгерд з'ехаў з Крэўскага замка ў Вільню. Ажно 32 гады стаяў ён на чале дзяржавы.

За гэты час узвысілася слава Вялікага княства, удвая павялічылася яго тэрыторыя. Працягваючы традыцыі свайго бацькі, Альгерд клапаціўся пра абарону ўладанняў, далучаў да Княства новыя землі. Меў ён перамогі над татарамі, якія рабілі частыя набегі на вялікалітоўскія землі. Мо менавіта з той пары запачаткавалася традыцыя сяліць палонных татар каля гарадскіх сцен, якая доўжылася цэлых 600 гадоў. Так было каля Крэва, Навагародка, Менска, каля шмат якіх іншых гарадоў Княства. Аселыя татары не толькі займаліся сельскай гаспадаркай, сведчаннем чаго, напрыклад, сталі Татарскія агароды ля старога менскага замчышча, але і павінны былі несці вайсковую павіннасць. Служылі яны сумленна, шчыра абаранялі інтарэсы Вялікага княства. Вядомы факт, што яшчэ пры княжанні Гедыміна, у час ягонай бітвы ў 1319 годзе з Тэўтонскім ордэнам, татары складалі перадавое княскае войска.

Нават у знакамітай бітве 15 ліпеня 1410 года на Грунвальдскім полі, дзе аб'яднаныя войскі Вялікага княства і Рэчы Паспалітай атрымалі доўгачаканую перамогу над крыжакамі, разам з беларускімі харугвамі бралі чынны ўдзел шматлікія татарскія воіны.

Вялікі князь Альгерд не забываўся пра свой Крэўскі замак. Ён дбаў пра яго магутнасць, клапаціўся пра падтры-

манне на належным узроўні абарончых здольнасцей. Гэтыя якасці атрымалі пачатак яшчэ падчас ўзвядзення замка. Галоўным будаўнічым матэрыялам служылі велізарныя валуны. У тутэйшых ваколіцах іх было не злічыць. З даўняй гісторыі вядома, што па нашай зямлі шмат тысячагоддзяў таму не адзін раз прасоўваліся леднікі. Яны як вялікім прасам прасавалі зямлю, дзе раўнялі яе, а дзе насоўвалі пагоркі, узвышшы. Леднікоў было шмат. І кожны з іх пакінуў свой след. Тое самае зрабіў і апошні, які адыходзіў з беларускай зямлі каля 15 тысяч гадоў таму. Пасля яго ў многіх месцах засталіся цэлыя россыпы валуноў, прынесеных велізарнай ледзяной тоўшчай са Скандынаўскіх гор. У ваколіцах Крэва іх і дагэтуль захавалася нямала. Вось чаму амаль сем стагоддзяў таму для замка скарысталі гэты зручны і бясплатны будаўнічы матэрыял.

## КРЭЎСКІЯ ВОЛАТЫ-БУДАЎНІКІ

Каб справіцца з магутнымі валунамі, трэба было валодаць неверагоднай сілай. Таму пра будаўнікоў Крэўскага замка засталося шмат легенд. Адна з іх апавядае, што замак узводзілі сапраўдныя волаты. Іншая дадае, што ім дапамагалі самі багі. Так ці інакш, а будаўнікі замка і на самай справе вызначаліся сваёй кемнасцю і дужасцю. Крэўскі замак паўставаў адначасова з Медніцкім, які знаходзіўся за сем міляў (гэта больш як 10 кіламетраў) ад Крэва. Калі медніцкім майстрам патрэбен быў мулярскі молат, яны гукалі крэўскім дойлідам. І тыя перакідвалі яго ў паветры з Крэва. Самі валуны, вага якіх некалькі соцень кілаграмаў, а мо і колькі тон, шчыльна, адзін да аднаго ўкладзены ў сцены на вышыню да 4 метраў. Вышэй да іх дадаецца цэгла. Сапраўды, без волатаўскай сілы зрабіць гэта немагчыма. Будаўніцтва ішло цяжка, пакут-

ліва, доўга. Тысячы сялян змушаны былі браць удзел у збіранні камянёў і падвозцы іх да месца будоўлі. Таму з той даўняй пары застаўся сярод людзей праклён нядобраму чалавеку: “Каб ты на Крэўскі замак валуны цягаў”.

А яшчэ легенды сведчаць, што новы мураваны замак меў падземныя хады-лёхі, якія звязвалі яго са старым гарадзішчам, дзе некалі знаходзіўся драўляны замак, з іншымі мясцінамі.

Волатаўская сіла будаўнікоў добра пасавала з магутным знешнім воблікам Крэўскага замка. Па форме ён нагадваў Лідскі, у аснове меў няправільны чатырохвугольнік са сценамі рознай даўжыні — ад 71 да 108 метраў. Вышыня іх дасягала 13 метраў, таўшчыня — 2,75 метра. Ягоную магутнасць падкрэслівалі вежы ў двух кутах, размешчаныя па дыяганалі. Адна з іх называлася Княскай. Архітэктурнай выразнасцю і велічнасцю яна спраўна адпавядала сваёй



назве. Вежа была трохпавярховая, амаль квадратная. Памерам 18 на 17 метраў, а ўвышкі больш за 25 метраў. Накрытая спачатку гонтай, а пазней чарапіцай-дахоўкай. У ёй знаходзіліся княскія пакоі, памяшканні для абслугі. Унізе размяшчалася вязніца. Як сведчыць гісторыя, не пуставалі ні пакоі, ні турма.

Хоць Крэўскі замак адрозніваўся сваімі мясцовымі асаблівасцямі, майстэрствам беларускіх дойлідаў, аднак меў і выразныя прыкметы еўрапейскай архітэктуры. Ён нагадваў шырока распаўсюджаныя ў Еўропе замкі-кастэлі. Іх галоўная абарончая вежа, круглая або квадратная, называлася, як мы ўжо згадвалі, данжонам. Яна служыла адначасова і жылым памяшканнем, выконвала прадстаўнічыя функцыі, з'яўлялася апошнім прыстанішчам для абаронцаў. Як, напрыклад, Княская вежа Крэўскага замка. Беларускімі данжонамі можна лічыць таксама вежы ў Камянцы, Бярэсці, Гародні, Навагародку, Тураве. Але да нашага часу яны амаль не захаваліся.

Не толькі сваёй архітэктурай, а і сістэмай абароны Крэўскі замак нагадваў Лідскі. На вышыні 10 метраў сцены мелі баявыя галерэі-памосты, якія трымаліся на драўляных бэльках. А праз кожныя 2,4 метра здавалася, што пазіралі сваімі вачамі на свет байніцы. Меліся і замаскаваныя запасныя выхады. Некаторыя даследчыкі лічаць, што існаваў своеасаблівы "ўваход" для вады, якой можна было напоўніць сажалку на ўнутраным двары.

Крэўскі замак складаў адну своеасаблівую лінію магутных крапасных умацаванняў разам з Лідскім, Навагародскім, Медніцкім і Трокскім. Усе яны мелі агульнадзяржаўнае значэнне і з'яўляліся надзейнымі замкамі на шляху агрэсіўных крыжакоў. Паданні сведчаць, што ўсе гэтыя замкі былі злучаны між сабой падземнымі хадамі. Гэта зніжала небяспеку іхняга захопу. Калі б, на-

прыклад, прышэльцы здолелі трапіць у адзін з замкаў, яго абаронцы па глыбокіх лёхах незаўважна перайшлі б у іншы. А тады, сабраўшыся з сілай, па гэтых жа падземных хадах воі маглі вярнуцца ў замак і знутры расправіцца з ворагам.

Гэткі ўмацаваны рубеж сапраўды адпавядаў вядомаму выслоўю, якое належыць мужнаму рускаму князю Аляксандру Неўскаму. Гэта ён у 1240 годзе перамог шведаў (Неўская бітва), за што атрымаў прозвішча Неўскага. У 1242 годзе адолеў нямецкіх рыцараў Лівонскага ордэна (Лядовае пабоішча). Пазней царква залічыла яго да ліку святых. Дык вось, Аляксандр Неўскі гаварыў: "Хто з мячом да нас прыйдзе, той ад мяча і загіне". Так шматразова было і ля сцен беларускіх замкаў. Крэўскі — не выключэнне.

Абарончай сілы яму дадавалі натуральныя прыродныя ўмовы. Яго ахоўвалі дзве ракі. Паблізу размяшчалася высокая Юрава гара. Яна выконвала ролю своеасаблівага назіральнага пункта. Гісторыя сведчыць, што кіраўнікі Вялікага княства Літоўскага надавалі асаблівую ўвагу абароне не толькі дзяржавы, а і саміх замкаў.

## МАГУТНАСЦЬ ЗАМКАЎ — КЛОПАТ ДЗЯРЖАЎНЫ

Згодна з існуючымі прадпісаннямі і традыцыямі, арганізацыяй абароны замкаў займаліся мясцовыя ўладныя структуры і высокая адміністрацыйная ўлада. Адпаведна свайму статусу, ваявода, напрыклад, адказваў за абарону і арганізоўваў яе ў сваім ваяводстве. Стараста займаўся гэтым у сваім старостве. Ваяводай у славянскіх народаў здаўна называўся военачальнік, правіцель, а ў Расійскай дзяржаве — той, хто стаяў на чале палка, атрада, горада. На сваіх землях яны адказвалі і за ахову дзяржаўнай мяжы, і за стан памежных замкаў. Замкі павінны былі мець дастаткова ваен-

нага рыштунку і ўсяго неабходнага на выпадак асады, вайны і іншых непрадбачаных сітуацый. Уладныя асобы дбалі і пра замкавы арсенал, інтэнданцкія запасы, пра шляхецкае войска і пра мясцовае апалчэнне. Але войны, аблогі і розныя сутычкі на беларускіх землях былі такія частыя, што давялося ўводзіць у ваяводствах і староствах нават спецыяльных чыноўнікаў —ураднікаў па пытаннях абароны. Ураднікі вялі ўлік шляхты, якая павінна несці службу, склікалі шляхецкае войска, арганізоўвалі яго навучанне, трэніроўкі, сачылі за матэрыяльным забеспячэннем.

Займаліся развіццём абарончых магчымасцей замкаў і гараднічыя. Яны адказвалі за захаванне іх "в целости для часу потребы от неприятеля". Калі патрабавалася, гараднічыя арганізоўвалі аднаўленне земляных валоў вакол замкаў, равоў з вадой, драўляных частак умацаванняў, дбалі пра іх пашырэнне і збудаванне новых. Непрыступнасць і боегатоўнасць замка мусіла быць заўсёднай. Жыхары горада — мяшчане, а таксама шляхта — Вялікага княства Літоўскага ў XIV — XV стагоддзях нароўні выконвалі вайсковую службу: "конно, збройно и оружно". Гэта была нялёгкая справа, якая вымагала вялікіх затрат. Справіцца з ёй маглі толькі заможныя. Таму на беларускіх землях у розны час і ў розных рэгіёнах у склад мяшчан уваходзілі розныя катэгорыі гарадскіх жыхароў. У Вялікім княстве гэта былі рамеснікі, дробныя гандляры, купецтва і іншыя. У XV стагоддзі да беларускіх мяшчан адносілі толькі тую частку рамеснікаў, купцоў, дробных гандляроў, якая падпарадкоўвалася магдэбургскаму праву. Сярод тых, хто выконваў вайсковы абавязак, былі конныя мяшчане — нашчадкі тых баяр, што пераехалі ў горад, але захавалі свае маёнткі, путныя, пасельскія — якія жылі ў маёнтках і сёлах. Гэта былі прывілеяваныя мяш-



чане, і яны вызваляліся ад даніны. Аднак, нягледзячы на сваё далёка не беднае жыццё, ніхто не хацеў мець лішнія затраты, кожны ўмеў лічыць грошы і ашчаджаць свае багацці. Таму сярод тых, хто мусіў несці вайсковую службу, было нямала ахвотнікаў выкруціцца. Улада ж настойліва выкрывала гэта, змушала дакладна выконваць свае абавязкі.

Бяднейшыя жыхары Вялікага княства, хто не мог спраўляць службу па ўсіх правілах, бралі ўдзел толькі ў асобных яе відах, напрыклад, у абароне замка ад непрыяцеля. Аднак на ўскраінных землях Княства, дзе замкам надавалася асаблівая роля, да іх абароны далучалі як мяшчан, так і "зямян". Сярод зямян былі як больш заможныя, так і бяднейшыя. У залежнасці ад гэтага яны па-рознаму выконвалі сваю вайсковую павіннасць. Наогул жа зямяне — гэта частка феадальнага саслоўя ў Вялікім княстве. Яны адносіліся

да той катэгорыі насельнікаў, якая абавязана была несці вайсковую службу, а ў час вайны — з канём і рыштункам. І нават пазней, калі вайсковая служба стала прэстыжнай і да яе часта не дапускалі не толькі зямян, але і некаторых гарадскіх жыхароў, абароне замкаў надавалася прыярытэтнае значэнне.

У залежнасці ад свайго багацця месцічы маглі браць удзел разам з ваяводаю ў пагоні за ворагам, але толькі тады, калі мелі каня. Пешыя абаранялі сам замак. Калі ўзнікала небяспека, у замках выстаўлялі назіральную стражу. Яна несла вахту на сценах і вежах, ахоўвала подступы. Але гэта не магло гарантаваць засцярогу ад раптоўнасці і нечаканасці. Дзеля большай бяспекі і надзейнасці выстаўляліся дазорныя атрады і ў полі. Яны мусілі паведамляць пра небяспеку, якая пагражала не толькі свайму замку, а і суседнім. Значыць, ужо тады існавала своеасаблівая калектыўная абарона.

Умацаванню абараназдольнасці дзяржавы і магутнасці замкаў асаблівую ўвагу надавалі гаспадары Княства — вялікія князі літоўскія. Напрыклад, вялікі князь Гедымін для адпору розным ахвотнікам на вялікалітоўскія землі вымушаны быў па ўсёй мяжы збудаваць умацаваныя замкі і гарады. Вырашаць абарончыя пытанні было лягчэй, калі Вялікае княства цалкам захоўвалася самастойна, да Крэўскай уніі. Пасля таго як утварылася персанальная унія Княства і Кароны, узніклі і пэўныя цяжкасці. Звязана гэта было найперш з тым, што вялікі князь, які стаў адначасова і каралём польскім, мусіў пастаянна знаходзіцца ў Кракаве, бо Польскае каралеўства шматкроць больш падвяргалася ваеннай небяспецы. Вялікаму князю нават не хапала часу, каб прыязджаць на вялікалітоўскія сеймы. А без гаспадара нельга вырашыць самыя значныя пытанні, найперш звязаныя з вайной, з абаронай зем-

ляў. Таму і вымушаны былі паны-рада, вышэйшы орган дзяржаўнай улады ў ВКЛ, звяртацца да вялікага князя з просьбай, каб ён папрысутнічаў на сейме. Так, напрыклад, у 1526 годзе паны-рада скіравалі просьбу да вялікага князя, які быў і польскім каралём, Жыгімонта Старога, запрашаючы яго прыехаць у Княства, каб сярод іншых пытанняў вырашыць праблему ўмацавання Кіеўскага замка.

У 1531 годзе паны-рада сведчылі вялікаму князю, што яны ва ўсіх земскіх справах выяўляюць дбайны клопат, але дабіваюцца меншых поспехаў, як пажадана. Прычына — іх не слухаюцца ўраднікі і земскія. Таму патрабуецца ўмяшанне вялікага князя, каб навесці належны парадак. Бо ў выніку такога становішча ўскраінныя памежныя замкі, якія выконвалі асаблівую ахоўную функцыю, прыйшлі ў заняпад, не забяспечаныя ні баявымі, ні харчовымі прыпасамі. Каб зрушыць справу з месца, патрабаваўся прыезд вялікага князя ў сваё гаспадарства і яго адмысловы загад. Таму паныРада прасілі Жыгімонта Старога прыехаць калі не "ўнутр" Вялікага княства, дык хоць бы ў Бярэсце.

Абароне дзяржавы і ахове замкаў удзялялася такая ўвага, што перад гэтым адступалі іншыя дзяржаўныя справы. Нават не ўсе тагачасныя дзяржаўныя чыны маглі браць удзел у сеймах Княства, калі справа датычыла абарончых праблем сваіх замкаў. Напрыклад, ваяводы і намеснікі памежных замкаў не мусілі ехаць на сейм у 1512 годзе. Калі на дзесятым тыдні пасля Вялікадня ў 1521 годзе ў Менску павінен быў адбыцца чарговы сейм, начальнікам ускраінных замкаў было прадпісана, "абы на тых замках вашое милосты украинных мешкалы и в доброй опатренности их заховали". Падчас склікання сейма 1534 года ваяводзе полацкаму было загадана заставацца ў замку для яго абаро-

ны ў выпадку небяспекі, бо ў гэты час рыхтавалася чарговая збройная справа з Маскоўскім княствам. Чыны Навагарадзенскага сейма 1538 года скардзіліся вялікаму князю Жыгімонту Старому, што ваяводы кіеўскі, полацкі і віцебскі заўсёды знаходзяцца ў замках сваіх ваяводстваў і рэдка ездзяць на вальныя сеймы.

Як і любая дзяржава, Вялікае княства ўводзіла шмат павіннасцей для сваіх грамадзян. Толькі для сялян іх мелася 120 – 140. Але найбольш складанай і цяжкай лічылася будаўніцтва і рамонт замкаў. Бо вядома, што беларускія землі ўвесь час былі на ваенных скразняках. А раз небяспека была пастаяннай, то і клопат пра абарону як ад знешніх ворагаў, так і ад унутраных міжусобіц мусіў ажыццяўляцца на дзяржаўным узроўні. Таму з канца XIV стагоддзя адной з важнейшых павіннасцей для сялян становіцца будаўніцтва і рамонт замкаў ("городовое дело", "замковая работа"). Гэтыя работы мелі пастаянны характар. На іх зганялі тысячы сялян. Акрамя будаўніцтва і рамонту замкаў у сваіх мясцовасцях, беларускія сяляне спрычыняліся да гэтай справы і на ўскраінных землях Вялікага княства Літоўскага.

Напрыклад, згарэлы Уладзімірскі замак кароль і вялікі князь Казімір загадаў аднаўляць сялянам Слонімскай, Ваўкавыскай, Берасцейскай і іншых валасцей. У 1496 годзе на рамонт Кіеўскага замка было накіравана 400 беларускіх сялян. А даннікі (тыя, хто павінен быў плаціць даніну) Мазырскай воласці ў 1552 годзе мусілі даваць вялікаму князю Жыгімонту Аўгусту даніну мёдам і грашыма замест многіх натуральных збораў. Аднак нічым не маглі яны замяніць абавязак будаваць і рамантаваць Мазырскі замак, быць у ім старажамі.

Калі ж на нейкай тэрыторыі ўзнікала пагроза, калі трэба было тэрмінова рыхтавацца да сустрэчы з ворагам, аб'-

яўляўся "кгвалт". Тады неадкладна мусілі з'яўляцца на службу ўсе, каму належала, і ў адпаведнасці з загадзя вызначанымі абавязкамі. Статуты многіх гарадоў таксама прадугледжвалі неабходнасць абароны. Пра гэта сведчаць запісы аб тым, што месцічы павінны выступаць на абарону замка і горада са сваёй зброяй. Напрыклад, жыхары Оршы бараніць замак мусілі "все и кождый", а ў дамах сваіх павінны былі мець "стрельбу вшелякую и иную оборону, то есть рогатину и што иного ку той обороне належить". Нават жыхары бліжэйшых наваколляў у выпадку "кгвалту" павінны былі браць удзел у абароне замка.

Да ваеннай службы мела непасрэднае дачыненне ахова на полі — стража. Яна абавязана была атрымліваць звесткі пра непрыяцеля, яго перамяшчэнне, каб своечасова паведаміць абаронцам замка пра намеры ворага. Гэткая ж стража выстаўлялася ля замкавай брамы, каля арсенала, артылерыйскіх складоў. Часта месцы яе размяшчэння станавіліся геаграфічнамі назвамі. Такім чынам у Мінску, напрыклад, з'явілася Старажоўка. Так назвалі былую паўночную ўскраіну на выездзе з боку Старавіленскага і Даўгінаўскага трактаў у Барысаўскім напрамку, дзе знаходзілася старажавая застава.

Калі ж небяспека была пастаяннай, стража мела свае пастаянныя, найбольш выгодныя месцы. Напрыклад, у Браславе палявую ахову няслі 8 месцічаў у 4 месцах, а стараставы людзі стаялі толькі ў адным месцы і было іх 6 чалавек. Ад ступені рызыкі і аддаленасці ад замка залежала і аплата стражнікам. Чым далей у поле, тым большыя выплаты. Чым меншая небяспека паблізу ад замка, тым меншыя. Калі які-небудзь месціч не хацеў быць стражнікам, ён мог наймаць іншага. Але нанятаму мусіў плаціць.

Часта замкавую стражу называлі клікунамі. Гэта было

звязана з тым, што днём ахова стаяла ля варот, а ноччу знаходзілася на сценах альбо ў вежах і павінна была "клікаць" кожнага падазронага, што набліжаўся да замка.

### ПРЫВІДЫ НА ЗАМКАВЫХ СЦЕНАХ

Такая вось сістэма абароны замкаў існавала ў Вялікім княстве Літоўскім. Прадугледжваліся ўсе магчымыя і неабходныя меры бяспекі. Але часам абарончай моцы замкам дадавалі розныя страшныя показкі і легенды пра іх. Здаралася, іх выдумлялі самі стражнікі і ахоўнікі. Асабліва калі не пагражала небяспека і хапала вольнага часу. Мо менавіта тады і ўзніклі расказы пра шматлікія прывіды, якія любілі сяліцца ў замках? Бо які ж гэта сярэднявечны замак, калі няма ў ім прывідаў, калі не складзены пра яго легенды і паданні. А сама стража ў такіх прыгодах заўсёды выступала разумнай і хітрай. Пасля гэтыя показкі разыходзіліся па ўсіх ваколіцах, траплялі ў аналы гісторыі, у кнігі.

Асабліва шмат прывідаў пасялілі людзі ў Нясвіжскім замку. Найбольш адметны з іх — Чорная Дама. Кажуць, яна заўсёды з'яўлялася ў палацы напярэдадні розных нечаканасцей і катастроф. Яе баяліся нават гаспадары, бо з ёй на княскія землі прыходзіла бяда. Апошні раз Чорную Даму бачылі ў Нясвіжы напярэдадні верасня 1939 года, перад самым пачаткам Другой сусветнай вайны. Пасля таго князі Радзівілы назаўсёды пакінулі сваё родавае гняздо і з'ехалі з Беларусі. Больш Чорная Дама Нясвіжскі замак не наведвае. Значыць, непрыемнасці абмінуць гэты старадаўні горад, які даўней называлі сапраўдным беларускім Парыжам.

У Крэўскім замку таксама не абыходзілася без прывідаў. Аднойчы ў якасці яго давялося выступіць нават самому Вітаўту, будучаму вялікаму князю. А адбылося гэта вось як.

Міжусобная барацьба за велікакняскі пасад, за палітычнае першынство ў дзяржаве насіла зацяты характар. Не спынялі яе нават сваяцкія адносіны. Быў час, калі вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Ягайла адчуў небяспеку з боку свайго пляменніка Кейстута, паважнага і паважанага дзеяча дзяржавы. У 1382 годзе Кейстут разам са сваім сынам Вітаўтам выступіў супраць Ягайлы. Тады, каб пазбавіцца ад небяспекі, Ягайла заманіў Кейстута і Вітаўта ў Вільню, нібыта дзеля заключэння дамовы аб міры. Але гэта была толькі хітрасць і выгадны разлік. Ягайла загадаў схапіць сваіх супернікаў. Кейстута і Вітаўта адправілі ў Крэва, узялі пад варту ў таўстасценных лёхах Княскай вежы. Угаворвалі адмовіцца ад прэтэнзій на ўладу, прапаноўвалі сяго-таго адступнога.

Але горды сівы Кейстут, які зведаў і смак улады, і чалавечую спрыяльнасць, і хітрыкі міжусобнай барацьбы, не падаваўся на ўгаворы. І тады адбылося страшнае. Ягайла аддаў загад знішчыць непакорнага князя. Гэта таемна зрабілі князевы ахоўнікі-памочнікі. Яны задушылі Кейстута залатым матузом ад ягонага ж урачыстага ўбору.

Вось як пра гэта паведамляе Супрасльскі летапіс: “Князя великого Кестутия, дяду своего, оковав, ко Креву послали и всадили во вежю, а князя великого оставили Витовта еще во Вилни. И тамо во Креиве пятои нощи князя великого Кестутия удавили коморникы князя великога Ягайлавы: Прокша, што воду давал ему, а были ины, Мостев брат а Кучюк а Лисица Жыбентяи. Таков конец стался князю великому Кестутию”. А людзі адразу ж назвалі Княскую вежу вежай Кейстута. Ды гэтае злачынства не было ў замкавых лёхах адзіным і апошнім.

Прывід жа гэтай непатрэбнай ахвяры часта з’яўляўся на сценах і вежах, у палацавых



пакоях, палохаючы насельнікаў і нагадваючы ахвотнікам несправядлівых і злосных дзеянняў пра абавязковую адплату за злачынства.

Узбунтаваны такімі дзеяннямі вялікага князя, Вітаўт шчыра аплакваў горкі лёс бацькі і паплечніка па змаганні супраць Ягайлы. Аднак ён не кінуўся на калені, не папрасіў літасці. Вітаўт выношваў план уцёкаў з вязніцы.

Тады і з'явіўся на замкавай сцяне не прывід Кейстута, а жывы прывід — Вітаўт. Пра гэта з рознай ступенню дэталізацыі згадваюць практычна ўсе важнейшыя тагачасныя летапісцы. Як сведчанне вынаходлівасці Вітаўтавай жонкі Ганны, якая прыдумала пераапрануць мужа ў вопратку служанкі і выбавіць з вязніцы. Як доказ намеру Вітаўта помсціць Ягайлу за смерць бацькі і непаважлівыя адносіны да яго самога.

Адседзеўшы ў той вязніцы, дзе знаходзіўся яго бацька, Вітаўт апынуўся за сценамі

Крэўскага замка, а пасля за межамі Вялікага княства. Сам вялікі магістр крыжацкага ордэна Конрад быў гатовы аказваць дапамогу. Ведама — гэткая асоба прасіла спрыяння. Ды і ў планы Конрада па заваёве славянскіх зямель гэта клалася выгадным радком. Тым самым хітры крыжак чужымі рукамі распальваў агонь незадаволенасці і варожасці паміж уладнымі асобамі Вялікага княства, падкідваў паленцы ў вогнішча міжусобных сутычак.

## ЗАГАДКА КЕЙСТУТА

Аднак, аказваецца, гісторыя не можа абыходзіцца без загадак, таямніц і сваіх уласных легенд. Тое здарылася і з Кейстутам. Шмат хто з пазнейшых даследчыкаў вылучаў розныя версіі, дапушчэнні і здагадкі адносна ягонай ролі ў гісторыі Вялікага княства, узаемаадносін з Ягайлам і прычыны смерці. Свой падыход выявіў і польскі даследчык Стэфан Кучыньскі ў кнізе пра караля Ягайлу, выдадзенай у Варшаве ў 1987 годзе. Ён выказвае сумненне ў тым, што Кейстут быў задушаны па загаду Ягайлы. Спасылаецца на крыніцы, адны з якіх лічаць, што ніхто не ведае, як памёр Кейстут, другія сведчаць, што адбылося самазабойства, трэція абвінавачваюць Ягайлу. Кучыньскі прытрымліваецца іншай версіі. Ён мяркуе, што віна Ягайлы не мае неабвержных доказаў. А калі дапусціць, што гэтае забойства нават мела месца, то адбылося альбо насуперак волі Ягайлы, альбо без яго ведама і тым больш без папярэдняй згоды.

Як адзін з доказаў гэтага Кучыньскі прыводзіць дапушчэнне, што калі б Ягайла захацеў пазбавіцца ад супернікаў, то загадаў бы знішчыць абодвух: Кейстута і Вітаўта, а не аднаго састарэлага свайго дзядзьку, якому і так заставалася жыць нядоўга. Аднак жа Кучыньскі не згадвае, што шмат якія крыніцы менавіта так і лічаць: Ягайла намерваўся пазбавіцца ад абодвух. Іншая

рэч, што Вітаўту ўдалося ўцячы. І яшчэ польскі гісторык даводзіць, што Вітаўт, які павінен быў стаць зацятым ворагам Ягайлы з-за забойства бацькі, не чыніў варожых акцый супраць яго. Ён нібыта толькі прасіў Ягайлу праз пасрэдніцтва крыжакоў, каб той аддаў бацькаву належнасць, а сам намерваўся "лаяльна" яму служыць. Не баючыся помсты, Вітаўт вяртаецца ў Княства і з 1392 года ажно 38 гадоў "верна і лаяльна" супрацоўнічае з Ягайлам.

"Калі б вінаваціў Ягайлу ў смерці бацькоў, — піша С. Кучыньскі, — то цягам тых трыццаці васьмі гадоў меў тысячы аказій, каб зрабіць яго вязнем, здрадзіць, забіць. А тым часам аказваў яму прыязнасць і шанаванне".

Польскі гісторык мяркуе, што тагачасны Вітаўт, які стаў ужо вялікім літоўскім князем і быў цесцем вялікага князя маскоўскага (яго дачка Соф'я выйшла замуж за Васіля І Дзмітрыевіча, старэйшага сына Дзмітрыя Данскога), які мог разлічваць на падтрымку крыжакоў і Залатой Арды і якога шматкроць падбухторваў да выступлення супраць Ягайлы Зыгмунт Люксембургскі, не здолеў бы супрацоўнічаць з Ягайлам, калі б ведаў, што той з'яўляецца забойцам ягоных бацькі і маці. Пэўная слушнасць у гэтых развагах ёсць. Аднак, падаецца, не ўсё было так проста. І нават спасылкі Кучыньскага на тое, што ўсё гэта прыдумалі крыжакі, якія адпрэчылі версію самазабойства Кейстута, а абвінавацілі Ягайлу, не да канца пераканаўчыя. Цікава, што нават хроніка Віганда падае дзве версіі смерці Кейстута. Адна — Кейстута задушылі, другая — ніхто не ведае абставін ягонай смерці. Не выключае польскі гісторык верагоднасці таго, што сам Ордэн, які ненавідзеў Кейстута за яго антыкрыжацкія дзеянні, меў дачыненне да смерці свайго ворага, намовіўшы зрабіць гэта некага з літвінаў.



Разглядае Кучыньскі версіі ўдзелу ў забойстве Кейстута родзічаў Ягайлы, якія не хацелі быць адсунутымі ад улады, Ягайлавай маці — вялікай княгіні Улляны, якая часта дзейнічала без ведама сына. Мог спрычыніцца да гэтай адстрашнай справы і брат вялікага князя Скіргайла, які трымаў у 1382 годзе, калі не стала Кейстута, блізкія кантакты з крыжакамі і суправаджаў Кейстута ў Крэўскую вязніцу. I зусім дзіўнае дапушчэнне Кучыньскага, што ўцёкі Вітаўта з Крэўскага замка да крыжакоў адбыліся з маўклівай згоды Ягайлы, які пасля смерці Кейстута апасаўся за жыццё ягонага сына. На карысць гэтага нібыта сведчыць тое, што Ягайла назаўтра ж пасля ўцёкаў сустрэўся з жонкай Вітаўта Ганнай і не толькі не пакараў яе, а дазволіў услед за мужам з'ехаць за межы Княства.

I ўжо іншыя крыніцы і іншыя аўтары, прыхільнікі версіі невінаватасці Ягайлы, у прыватнасці Карл Шайноха, які напісаў у другой палове XIX стагоддзя надта аб'ёмную двухтомную працу "Ядвіга і Ягайла", дадаюць новыя дэталі ў доказ такога падыходу. Калі Скіргайла прыехаў у Крэва, каб сустрэцца з Кейстутам, то знайшоў яго мёртвым. Ён адправіў цела свайго дзядзькі ў Вільню. Ягайла вырашыў зрабіць надзвычай пышнае пахаванне ў адпаведнасці з язычніцкай традыцыяй. На самым пашаноўным і святым для віленчукоў месцы — капішчы Святагора — адбылося спальванне цела Кейстута. Над глыбокай магілай склалі вялікае вогнішча. Былога вялікага князя апранулі ў багатае адзенне і паклалі на сухое дрэва кастра. Побач знаходзіліся меч, кап'ё і сайдак. Ля вогнішча паставілі яго вернага слугу, лепшага каня, пару хартоў і пару выжлаў, на грудзі паклалі лапы рысі і мядзведзя і паляўнічую трубу. Узнеслі малітвы, багам справілі ахвяраванні, услававілі дзеі Кейстута і запалілі касцёр. Полымя смаліс-

тага дрэва хутка забрала да сябе цела вялікага князя.

Сведчаць, што пры гэтым прысутнічалі мечаносцы, якія былі здзіўлены і ўзрушаны гэткім звычаем. Асабліва, калі памост над магілай прагарэў і касцёр з целам праваліўся ў глыбокую магілу. На пахаванні не было нікога з сямейнікаў Кейстута. Ягоную жонку, былую вайдэлотку Біруту, якой споўнілася 60 гадоў, у гэты самы час утапілі ў Нёмане, сын Вітаўт сядзеў у Крэўскай вязніцы, іншыя дзеці былі невядома дзе.

Вось якія, аказваецца, таямніцы хаваюцца ў мурах магутнага некалі Крэўскага замка.

## КРЭЎСКІЯ НАСЕЛЬНІКІ

За сваю доўгую гісторыю замак зведаў шмат спусташэнняў, аблог, штурмаў. Коштам жахлівых страт адстойвалі нашы продкі права быць гаспадарамі ў сваёй хаце, доме, горадзе, надзеле — на сваёй зямлі. Абараняліся не толькі ад набегаў далёкіх ворагаў. Міжусобная барацьба таксама прыносіла шмат шкоды. Замак штурмам браў мяцежны князь Свідрыгайла. Гэта адбылося ў 1433 годзе, праз тры гады пасля смерці вялікага князя Вітаўта, якога народ назваў Вялікім. За першынство ў дзяржаве пачалі змаганне Свідрыгайла — сын першабудаўніка Крэўскага замка Альгерда, і сын "старога і гордага" Кейстута Жыгімонт.

Але Свідрыгайла быў хітрэйшы і больш вопытны ў інтрыгах. Ён даўно хацеў заняць вялікакняскі трон. І імкнуўся да яго ўпарта. Але выпадак надарыўся толькі пасля смерці Вітаўта. Вось тады Свідрыгайла "приде ко Криеву и стояша два дни взяша Криево мурованны и сожже, а людей много посекоше и в полон поведоша". Так паведамляў пра асаду і захоп мураванага Крэўскага замка Супрасльскі летапіс.

У 1445 годзе разыгралася чарговая інтрыга каля веліка-

княскага трона. Князь Міхалышка разам з князямі Валожынскімі меў намер забіць вялікага князя Казіміра і захапіць уладны пасад. Ля сцен Крэўскага замка адбылася крывавая сутычка. Змоўшчыкі пацярпелі паражэнне. Але дасталося і замку.

Так і жыў ён — ад асады да аблогі, ад штурму да бітвы. Час тут, як і на ўсёй тагачаснай беларускай зямлі, лічылі ад вайны да вайны. Улада, высокі пасад, велікакняскі трон вабілі многіх ахвотнікаў пакіраваць дзяржавай. Замак штурмавалі, разбуралі, а ён упарта і настойліва аднаўляўся зноў і зноў. Пасля адной з такіх падноваў у 1470 годзе ён нават уваходзіў у шасцёрку лепшых мураваных замкаў Вялікага княства.

У складаных сітуацыях замак даваў прыстанішча розным гнаным асобам. За магутнымі сценамі знаходзілі прытулак Ягайлаў бацька Альгерд Гедымінавіч і сам Ягайла. У красавіку 1564 года ў Вялікае княства Літоўскае ўцёк рускі князь Андрэй Курбскі, дзяржаўны дзеяч, пісьменнік, перакладчык. Тут схаваўся ён ад жорсткасці і самадурства цара Івана IV Грознага. Хоць тагачасны Статут Вялікага княства забараняў іншаземцам займаць пасады і набываць зямлю, ды такой знанай асобе зрабілі выключэнне. Кароль польскі Жыгімонт Аўгуст падараваў Курбскаму Крэўскае староства. Князь жыў у замку. Кароль увесь час апекаваўся высокім крэўскім жыхаром. Нават умешваўся ў яго гаспадарчыя стасункі. Так сталася, што ў 1568 годзе князь, заняты сваімі клопатамі, “забыўся” своечасова заплаціць падаткі, устаноўленыя на “сойме великом валном Городенском”, за маёнткі, што належалі яму ва Уладзімірскім павеце. А калі хацеў выправіць памылку, “поборцы” адмовіліся браць падатак без штрафных санкцый. Давялося ўмешвацца самому каралю і вялікаму князю Жыгімонту Аўгусту. 5 кастрычні-



ка 1568 года ён выдаў грамату, каб зборшчыкі прынялі падаткі ад старасты крэўскага — князя Андрэя Курбскага без штрафнога збору.

Але не толькі гэтыя правіны меў староста крэўскі Андрэй Курбскі. Не мірыліся часам яго падданыя з суседзямі. Тады даводзілася ўладжваць справу гаспадару дзяржавы. Сваёю граматаю ад 17 верасня 1568 года Жыгімонт Аўгуст прадпісваў князю Курбскаму вярнуць судамірскай кашталяншы Ганне Мацяеўскай 200 авечак, скрадзеных у яе ўладаннях.

Некаторыя гісторыкі лічаць, што менавіта ў Крэўскім замку ствараліся вядомыя лісты Курбскага да Івана Грознага. У іх князь спрачаўся з царом па важнейшых пытаннях уладкавання дзяржавы, абвінавачваў яго ў нечуваных ганеннях на ваяводаў. Гэтыя “выкрывальныя пасланні лютаму самадзержцу” разам з іншымі матэрыяламі склалі унікальны літаратурны помнік. “Сказа-

ния князя Курбского" ўпершыню былі выдадзены ў 1833 годзе, шматразова перавыдаваліся. А ў 1979 годзе выйшлі ў вядомай у СССР акадэмічнай серыі "Литературные памятники" пад назвай "Переписка Ивана Грозного с Андреем Курбским".

**"ВАРОЖЫ ПАТОП" НА КРЭЗА**

Як ужо згадвалася, было шмат ахвотнікаў заваяваць Крэва і сярод іншаземных захопнікаў. На самым пачатку XVI стагоддзя яго некалькі разоў даймалі аблогай перакопскія татары. Замак быў пашкоджаны. У 1519 годзе Крэва захапілі маскоўскія войскі.

А ў 1644 годзе на Крэва, як і на землі Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага, абрынуўся так званы "патоп". Гэты перыяд у гісторыі атрымаў такую назву таму, што на нашыя землі магутным патокам, як сапраўдны патоп, хлынулі шведскія войскі. Вядомы польскі пісьменнік Генрык Сянькевіч у 1884 – 1886 гадах нават раман пра тое напісаў, які так і называецца – "Патоп". Непапраўныя страты панеслі тады беларускія гарады, вёскі, мястэчкі, уся наша зямля. Напалову скарацілася тутэйшае насельніцтва, многія паселішчы зніклі з твару зямлі наогул. Мы ведаем пра гэткія жудасці з часу Вялікай Айчыннай вайны. Аказваецца, падобныя старонкі вынішчэння беларусаў у гісторыі былі неаднаразова.

Амаль цэлае стагоддзе пасля разбурэння Крэва ў 1667 годзе аб замку не было ніякіх згадак. Аднак настойлівыя і працавітыя крывічы не скарыліся лёсу. І ўжо ў 1743 годзе Крэва зноў з'яўляецца на гістарычным небасхіле. Яно згадваецца ў сувязі з установкай у мясцовым касцёле звона — значыць, жыццё людзей увахдзіла ў звыклую каляіну. Так паступова, крок за крокам нашы далёкія продкі ліквідоў-

валі жудасныя вынікі “патопу”, адбудоўвалі свае гарады, вёскі, замкі, ладзілі мірнае жыццё, аднаўлялі былую магутнасць дзяржавы.

Ды не толькі касцельны звон сведчыў пра адраджэнне тутэйшай зямлі і Крэўскага староства. Гэта пацвярджала размаітае жыццё сялян і месцічаў, развіццё гандлю. Бо вядома, што пасля шведскага “патопу” значна змяніўся нацыянальны склад беларускіх зямель. У Крэве пасялілася шмат яўрэяў, якія і стварылі яму гандлёвую славу. Існаваў нават Крэўскі гандлёвы шлях, што ўвасабляла тагачасную значнасць гэтага крывіцкага горада.

Важная роля Крэва ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага вызначалася і тым, што ў XVII – XVIII стагоддзях яно мела магдэбургскае права. Гэты прывілей на самакіраванне, які дапаўняўся судовым імунітэтам, падатковымі льготамі, правам валодання зямлёй, вызваленнем ад воінскай павіннасці, мелі толькі асобныя беларускія гарады. Згодна з магдэбургскім правам, перасяленне чалавека ў горад рабіла яго вольным ад прыгнёту. Разам з гэтым правам уводзіліся і неабходныя атрыбуты самакіравання – герб горада, пячатка, ратуша. Ратушу Крэва размясцілі ў адной з замкавых пабудоў. І толькі пасля 1795 года, калі ўсе беларускія землі апынуліся ў складзе Расійскай імперыі, калі перастала існаваць Вялікае княства Літоўскае, Крэваператварылася ў звычайнае мястэчка. Страціла яно і магдэбургскае права, бо ў Расіі яго не існавала. Знікла патрэба ў ратушы.

### КРЭВА НА ЕЎРАПЕЙСКІХ КАРТАХ

Але славы замка нельга было выкрасліць не толькі з тутэйшай гісторыі, а і з агульнаеўрапейскага кантэксту. Пра тое сведчаць шматлікія геаграфічныя карты, што выдаваліся ў Сярэднявеччы ў многіх еўрапейскіх краінах. На іх час-




та з'яўляецца і само паселішча Крэва, і Крэўскі замак. А гэта ўжо сур'ёзнае сведчанне ягонай значнасці не толькі ў эканамічным жыцці еўрапейскай супольнасці, але і прызнанне палітычнай ролі. Згадкі пра Крэва і замак можна знайсці на картах, выдадзеных у Рыме ў 1507 годзе, у Венецыі, Кёльне, Амстэрдаме, Парыжы. Прысутнасць на картах замка сведчыла пра ягоную важную абарончую функцыю, пра тое, што лічыцца з гэтым мусілі ахвотнікі выступіць паходам на беларускія землі. Аднак у сувязі з няспынным прагрэсам у сферы стварэння больш дасканалай зброі замак паступова траціў сваё абарончае значэнне. І ўжо ў 1749 годзе на нюрнбергскай карце Вялікага княства Літоўскага Крэва пазначана проста мястэчкам. Замак тут адсутнічае...

А некалі ж ён жыў так бурна і размаіта, што вядомасць разыходзілася па ўсім Вялікім княстве Літоўскім і за яго межы. Цягам многіх стагоддзяў

замак быў палітычным цэнтрам дзяржавы, часта выконваў лёсавызначальную ролю ў жыцці народаў еўрапейскіх краін. У XIV – XVII стагоддзях ён з'яўляўся рэзідэнцыяй вялікіх князёў Гедымінавічаў. Тут адбывалася шмат урачыстых сустрэч, баляў, забаў. У Крэве гасцявалі знаныя асобы з многіх зямель Вялікага княства і польскай дзяржавы. Тут тварылася тагачасная гісторыя. Сюды прыязджалі паслы з важнымі місіямі. Так было, калі ў замку жыў Альгерд. Да яго з вялікалітоўскай сталіцы Вільні прыбылі паслы ад вялікага князя, Альгердавага брата, Кейстута. Яны мелі задачу дамовіцца пра падзел і ўмацаванне ўлады ў Вялікім княстве.

Так было ў пярэдадзень Крэўскай уніі, заключанай у Крэўскім замку 14 жніўня 1385 года. Тады да Ягайлы прыехалі паслы з Кракава, каб прапанаваць яму стварыць дзяржаўны саюз Вялікага княства Літоўскага і Кароны Польскай.

## ЯГАЙЛА: З КРЭВА — У ВАВЕЛЬ

Чаму ж узнікла патрэба запрасіць язычніка, літвіна, вялікага князя Вялікага княства Літоўскага на вышэйшы польскі пасад? Найперш, з-за палітычных матываў, звязаных з неабходнасцю ўмацавання польскай дзяржавы і надзейнай абароны яе ад крыжацкіх памкненняў. Але існавала і рэальная неабходнасць. У 1382 годзе памёр польскі кароль Людвік І Вялікі, альбо Людвік Венгерскі, які да гэтага быў каралём Венгерскага каралеўства Лайашам Вялікім.

Засталася ягоная дачка-падлетак Ядвіга. У жніўні 1383 года з'езд польскай шляхты вырашыў аддаць карону Ядвізе. Гэта была цікавая і неардынарная асоба. З дзяцінства яна захаплялася музыкай, мастацтвам, навукай. Ведала пяць моў. Пакуль бацька быў на троне, жыла ў Венгрыі і толькі ў 10-гадовым узросце прыехала ў Польшчу. 16 кастрычніка 1384 года ў Вавельскім кафед-

ральным касцёле Ядвіга была каранавана на караля Польшчы. Як сведчаць польскія гісторыкі, менавіта так і называлася гэтае дзяўчо — кароль польскі. За вялікую самаахвярную дзейнасць на карысць Польшчы і касцёла Ядвіга ў 1997 годзе была кананізавана, прылічана да святых.

Аднак, вядома, кіраваць дзяржавай у адзінаццаць гадоў трошкі цяжкавата. Таму з улікам палітычных абставін палякі скіравалі позіркі да асобы вялікага князя літоўскага Ягайлы, які з 1377 года стаяў на чале магутнага Княства. Польскія гісторыкі адзначаюць, што ягоны бацька, вялікі князь Альгерд, здолеў стварыць "найбольшую ў Еўропе" дзяржаву. Яна займала каля 900 000 квадратных кіламетраў, у ёй жыло каля 2 мільёнаў чалавек — вялікая па тым часе лічба. З такой магутнасцю было выгадна паяднацца. Таму вёўся пошук розных шляхоў. У тым ліку і сямейных повязяў.

А каб не адхіляць ад улады маладую каралеву, вырашылі падшукаць ёй вартага жаніха. Ягайла быў на першым месцы. Але патрэбна дамова з маці Ядвігі — каралевай Эльжбетай . У Венгрыю "ў разведку" была выслана дэлегацыя ў складзе вядомых асоб з Кракава і Вільні. Эльжбета перадала права вырашэння пытання польскім панам. Аднак Ядвіга не згаджалася, упарцілася. Як гэта яна, такая маладзенькая, добра выкшталцоная і, як лічылі, самая прыгожая ў свеце, пойдзе замуж за 34-гадовага "паганскага варвара", які, кажуць, непісьменны зусім. Каралева ж пераўзыходзіла будучага мужа не толькі дасведчанасцю, прыгажосцю, але і сваім ростам — каля 180 сантыметраў. Недаверлівая Ядвіга нават падаслала да Ягайлы свайго чалавека, каб той спраўдзіў, ці такі ж самы гэты язычнік, як усе мужчыны.

А польская шляхта не драмала. Прадстаўнікі яе разам з

венгерскімі дэлегатамі накіраваліся ў Крэва. Тут 14 верасня 1385 года адбыліся перамовы. Паслы паабяцалі Ягайлу не толькі польскую карону, але і маладую каралеву за жонку. Узамен ён павінен ахрысціць язычніцкую Літву і сам прыняць каталіцтва. Ягайла згадзіўся. Аднак узнікла іншая замінка. Бо Ядвіга яшчэ ў 1378 годзе, у свае 4 гады, была заручана з аўстрыйскім князем Вільгельмам Габсбургам. Дык вось, даведаўшыся пра задуму шляхты ажаніць Ягайлу з Ядвігай, малады князь пачаў актыўна дзейнічаць. 15-гадовы "муж" каралевы летам 1385 года прыехаў у Кракаў, каб канчаткова афарміць шлюбныя справы і прад'явіць сваё права на карону.

Але гэта не ўваходзіла ў планы большасці польскай шляхты і вяльмож. Яны не хацелі паддавацца аўстрыйскаму ўплыву. Таму зноў накіравалі пасольства ў Вялікае княства. Ягайла сустрэўся з ім у Ваўкавыску 11 студзеня 1386 года. Пасланцы пацвердзілі свае прапановы. Гэты дакумент мае цікавасць з многіх пунктаў гледжання, таму прывядзём яго цалкам.

"Мы, Уладка, люблінскі стараста, Пётр Шафранец, — кракаўскі падстолі, Мікалай — завіхосцкі кашталян і Хрысцін, казімірскі гаспадар, — аб'яўляем да ўсеагульнага ведама, што ў пятніцу перад актаваю трох каралёў, 1386 года, прыбылі мы да непераможнага князя Ягайлы, міласцю Божай вялікага князя Літоўскага, гаспадара Русі, — з пасольствам ад шляхты і вяльмож польскіх, як вышэйшых, так і ніжэйшых, і наогул ад усяго народа каралеўства Польскага, з даверчымі граматамі святлейшага князя Уладзіслава, той жа самай міласцю Божай гаспадара Апольскай зямлі, а таксама згаданых вышэй вяльмож каралеўства. Моцай вось гэтых грамат ад імя тых жа вяльмож згадзіліся мы дамоўна са згаданым вялікім князем Ягайлам і канчаткова пастанавілі, што выбі-



раем і бяром яго за гаспадара і за караля таго ж каралеўства, г.зн. Польшчы, і зацвярджаем за ім, даём і пераказваем Ядвігу, народжаную каралеву польскую, для заключэння з ім вянчаннем законнага шлюбу. Гэтай вось нашай пастановай і дамоўна даём клятву і абяцаем, згодна з даручаным нам пасольствам ад усіх жыхароў Польскай кароны, непарушную моц, уладу і захаванне. Акрамя таго мы дамовіліся яшчэ і пастанавілі з тым жа вышэйшым князем Ягайлам, ад імя згаданых жыхароў, усеагульны з'езд у Любліне, у дзень ачышчэння Прасвятой Багародзіцы (2-га лютага), які мае хутка надысці. На гэты з'езд той жа князь Ягайла можа з'явіцца спакойна і бяспечна, разам са сваімі братамі і падданымі рознага стану. І будзе яму таксама дазволена выслаць у той час з поўнай бяспекай сваё пасольства, альбо ж паслоў сваіх ва ўсе памежныя месцы каралеўства Польскага, дзеля свабоднага

заканчэння яго спраў. А мы, вышэйзгаданая шляхта, абяцаем гонарам і нашай добрай славай, ад імя ўсіх падданых каралеўства Польскага, вышэйшаму князю Ягайлу, таксама ўсім яго братам і людзям, якія маюць быць на вышэйзгаданым з'ездзе, а таксама яго паслам, якія будуць праязджаць праз Польскую зямлю перад Люблінскім з'ездам, альбо тым, што жывуць там пастаянна, — усялякую бяспеку і ўсялякую свабоду рабіць і здзяйсняць, што ім будзе патрэбна. У сведчанне ж і дакладнасць гэтага, загадалі мы да гэтай граматы прывесіць нашы пячаткі. Адбылося і выдадзена ў Ваўкавыску, год і дзень, як сказана вышэй".

Як бачым, польскі бок дае высокую ацэнку вялікаму князю літоўскаму, нават моцна нахвальвае, каб закрануць яго самалюбства і тым самым схіліць да прыняцця станоўчага рашэння. Палякам патрэбен быў сапраўдны гаспадар і кіраўнік дзяржавы, надзейны абаронца ад знешніх ворагаў. Ягайла імпанаваў ім ва ўсіх адносінах. Таму і намагаліся ўгаварыць яго, нават насуперак думцы Ядвігі дамаганням Вільгельма. Бясспрэчна, што ў самім факце запросін гаспадара Вялікага княства на каралеўскі пасад прысутнічае і ацэнка ролі Княства ў тагачаснай еўрапейскай гісторыі.

Пасля сустрэчы ў Ваўкавыску польскія паслы запрасілі Ягайлу і вышэйшых асоб Княства на ўрачысты сейм у Люблін. Тут Ягайлу абралі каралём. А 12 лютага, у панядзелак, ён прыбыў у польскую сталіцу Кракаў, які з 1320 года з'яўляўся месцам каранацыі польскіх каралёў. Як сведчаць летапісцы, "з тых пор, як Кракаў стаў Кракавам, не было яшчэ гэткай вялікай, гэткай напоўненай важнымі паследкамі, урачыстасці… Каронныя вяльможы вядуць свайго выбранніка сярод грому трубаў і воклічаў народа ў замак, у каралеўскія палаты, да Ядвігі. Маладая каралева ў кароне… прымае пры-

вітанне Ягайлы". Назаўтра "літоўскія князі Вітолд, Свідрыгайла і Барыс паднеслі Ядвізе ад імя яе будучага мужа каштоўныя падарункі срэбрам, золатам, каштоўнымі камянямі і матэрыяй з далёкіх краін". А ў чацвер, 15 лютага, у Вавельскім кафедральным касцёле Ягайла прыняў хрышчэнне разам з братамі і баярамі. Вялікі князь атрымаў імя Уладзіслаў, яго родныя браты Вігунд, Карыгайла і Свідрыгайла сталі называцца Аляксандрам, Казімірам і Баляславам, а стрыечны брат Вітаўт — Аляксандрам.

18 лютага 1386 года, роўна ў дзень нараджэння Ядвігі, якой споўнілася 12 гадоў, у галоўнай польскай "катэдры" адбыўся ўрачысты шлюб. Гэта быў саюз не толькі дзвюх цікавых і моцных асоб, але і саюз Польшчы з Вялікім княствам Літоўскім, які доўжыўся ажно 4 стагоддзі. А быламу жаніху Ядвігі аўстрыйскаму князю Вільгельму кароль паабяцаў выплаціць 200 000 чырвонцаў няўстойкі. Ды не выкуп цешыў маладога князя. Ён прагнуў атрымаць не толькі прыгожую жонку. Праз усё жыццё спадзяваўся на польскую карону. Што толькі не рабіў дзеля гэтага, але безвынікова. Не атрымаў ні Ядвігі, ні кароны. Аднак цягам усяго свайго жыцця захоўваў памяць пра першыя заручыны і сваё першае каханне — Ядвігу.

Жыццё ж ішло сваім парадкам. У нядзелю 4 сакавіка 1386 года Ягайла быў каранаваны "арцыбіскупам гненжненскім і біскупам кракаўскім Баболяю" і стаў польскім каралём Уладзіславам II, заснавальнікам дынастыі Ягелонаў. На трэці дзень пасля каранацыі ў кракаўскім замку пачаліся пышныя вясельныя ўрачыстасці, якія доўжыліся некалькі дзён пры вялікай колькасці гасцей.

### ХРЫШЧЭННЕ ЛІТВЫ

Але адшумелі святочныя дні, і каралю давялося выконваць свае абяцанні. Адно з іх —

хрышчэнне Літвы. Пачаліся кастрычніцкія маразы, замерзлі непраходныя беларускія балоты, і Ягайла з велізарнай світай рушыў у шлях. З ”ляхским крестом” накіраваўся ён “в последний уголок, в последнюю лесную чащу язычества в Европе” — у Літву. Як вынікае з пазнейшых падзей, польскі кароль мусіў разбураць язычніцкія сімвалы і ўсталёўваць каталіцызм.

А калісьці ж Ягайлавы папярэднікі намагаліся годна ўшанаваць менавіта язычніцкія традыцыі, падтрымлівалі і пашыралі іх.

Шмат гадоў таму, калі з’явілася задума збудаваць у Вільні галоўны і самы пашаноўны язычніцкі храм у гонар Перуна з алтаром Зніча, ягоны заснавальнік звярнуўся да вешчуна. Князю хацелася ведаць, як доўга будзе існаваць гэтае збудаванне. Галоўны аракул выказаў гаспадару сваё прадбачанне: храм прастаіць столькі часу, колькі будзе жыць язычніцтва. Разам з адказам князь атрымаў нязвыклы дарунак-наказ — пэўную колькасць цаглін з таемнымі містычнымі знакамі. А заадно вяшчун паставіў умову: кожны год па адной цаглінцы ўмуроўваць у сцены храма. Так доўжылася сто дваццаць адзін год. І вось перад новым 1387 годам засталася ўсяго адна цаглінка. А на ёй — знак-сімвал двайнога крыжа. Значыць, наступіў той абяцаны вешчуном час афіцыйнага знікнення язычніцтва.

Мо таму, што язычнікі загадзя ведалі пра гэта, яны даволі памяркоўна аднесліся да місіі вялікага князя Ягайлы — польскага караля Уладзіслава II. У лютым 1387 года ў Вільні было арганізавана лацінскае епіскапства, якое мела 7 прыходаў, у тым ліку ў Крэве. На месцах галоўных язычніцкіх храмаў, дзе гарэў святы агонь Зніч, узводзіліся новыя каталіцкія храмы. Так было ў Вільні, дзе збудавалі галоўны кафедральны касцёл, у Крэве, у Навагародку, у многіх іншых гарадах Вялікага княства.



Калісьці дзед Ягайлаў, вялікі князь Гедымін, дбаў пра тое, каб стварыць неабходныя ўмовы для язычнікаў. “Хроніка Літоўская і Жамойцкая” паведамляла: “Поставил еще Кгедимин болвана перунова з каменя кременистого великого, с которого огонь попы поганские кресали, в руках держачи, и огонь ему вечный з дубины в день и в ночи палили на том местцу, где теперь костел святого Станислава в замку от Ягелля, внука Гедиминавого, збудованный”. Нават галоўны жрэц Ліздзейка, якога выгналі з Перуновага храма, мусіў жыць пустэльнікам у дрымучай пушчы.

Патухалі на свяцілішчах вечныя агні, высякаліся святыя дубы на капішчах, забіваліся шанаваныя змеі і яшчаркі. Усё гэта заахвочваў Ягайла, які пасля наведвання Вільні выправіўся ў паездку па Княстве. Каралеўскі аб’езд доўжыўся некалькі месяцаў. Не выключана, што Ягайла наведаў Крэва, якое ён перадаў свайму ахрышчанаму брату Вігунду — Аляксандру. Праўда, лёс апошняга крэўскага князя склаўся трагічна. У 1391 годзе ў выніку міжусобных інтрыг і памкненняў да ўлады Вігунд быў атручаны.

Дзеля назірання за вялікакняскімі справамі і кіравання Княствам кароль прызначыў брата свайго Скіргайлу, пакінуўшы за сабой тытул “вышэйшага князя”. Гэта моцна ўгнявала Вітаўта, які спадзяваўся на большае спрыянне караля. Ягайла ж, наадварот, усяляк стрымліваў Вітаўта, абмяжоўваў яго. “Нават дзіця маё, маю дачку, не дазволена мне было аддаць замуж за каго я хацеў, — прызнаваўся Вітаўт, — баючыся, каб я такім чынам не набыў сяброў і аднадумцаў, хоць многія суседнія князі прасілі яе рукі. Адным словам, я быў як нявольнік у падпарадкаванні Ягайлы, а брат яго, Скіргайла, уладар маіх родных Трок, замахваўся на маё жыццё”.

Паездкі Ягайлы па вялікалітоўскіх землях скончыліся ў

чэрвені, калі ён зноў вярнуўся ў Вільню, каб падвесці вынікі. Іх неўзабаве ўхваліў і ўзвялічыў папа Урбан VI. У сваім пасланні з Рыма ён не шкадаваў высокіх слоў: “Сярод усіх каралёў зямлі табе належыць першае месца ў пачуццях удзячнасці святой Рымскай царквы, маці нашай! Вітаем цябе, узлюблены сын, верны слуга, які за справы свае атрымаў вартую ўзнагароду, вянец зямной велічы і, вядома, з часам атрымае “вянец нябесны”. Суцяшай сябе, сыне, што, маючы загінуць з цэлым народам, як таемны скарб, ты знойдзеш! Суцяшай сябе ў глыбіні твае душы, што гэткая вялікая слава ходзіць па ўсім свеце пра дзеі твае і што ты, такі прыязны і мілы, знаходзішся ў бляску славы ў лоне маці-царквы!”

У ліпені 1387 года Ягайла вярнуўся ў Кракаў. Што ж пакінуў ён пасля сваёй паездкі па землях Вялікага княства? Змрочныя пасля патухлых Знічаў пушчы, зруйнаваныя язычніцкія капішчы і свяцілішчы, высечаныя святыя дубровы. Ды не так проста было вынішчыць даўнія язычніцкія традыцыі. Калі просты люд цішком захоўваў іх, не шкодзячы і хрысціянскай веры, то некаторыя з князёў і ўладных асоб спрабавалі адкрыта супраціўляцца. Не толькі, а мо не так нават рэлігіі, як пагрозе сваім паўнамоцтвам, сваёй княскай самастойнасці і моцы. А паколькі гэтыя памкненні супадалі, то ў падмогу сабе яны бралі язычніцкіх багоў, якія раптоўна пазбавіліся сваіх спрадвечных свяцілішчаў. Некаторыя гаспадары земель і замкаў пачалі выступаць супраць Крэўскай уніі, бо ў ёй бачылі прычыны пэўных негатыўных праяў сёння і магчымасць узмацнення іх у будучым. Акрамя ўсяго унія ўзвышала ролю каталіцызму ў тагачаснай дзяржаве. Насаджэнню каталіцкай веры на беларускіх і іншых землях спрыяла і тое, што самі Гедымінавічы, дынастыя вялікіх князёў і палітычных дзеячаў Вяліка-

га княства, Венгрыі, Чэхіі, таксама прынялі новую веру. Здавалася, Ягайла – Уладзіслаў баяўся, што без апоры і падтрымкі духоўнікаў ягоная ўлада не будзе цалкам моцнай і непарушнай. Першы крок Ягайлы аказаўся знакавым. Бо ўжо ў 1480 годзе падчас кіравання яго малодшага сына польскага караля Казіміра IV Ягелончыка быў прыняты спецыяльны дакумент, які забараняў будаваць новыя і рамантаваць старыя праваслаўныя храмы.

### ТРЫ ТАІНСТВЫ ЯГАЙЛЫ

Ды сівабароды Пярун не цярпеў гэткіх здзекаў. Ён помсціў Ягайлу за такое святатацтва. Супраць улады караля, супраць акаталічвання ім беларускіх і ўкраінскіх зямель выбухнулі паўстанні. Іх узначальвалі полацкі князь Андрэй Альгердавіч, а таксама будучы вялікі князь Вітаўт. Аднак перамогі яны не атрымалі. Улада караля польскага і вышэйшага князя, кіраўніка дзвюх дзяржаў, была моцная. Ягайла аказаўся прадбачлівым палітыкам. Каб не ўскладняць адносін і не аслабляць новаўтвораны міждзяржаўны саюз, Ягайла прызнаў Вітаўта вялікім князем літоўскім. У выніку Віленска-Радамскай уніі 1401 года ён атрымаў у пажыццёвае валоданне Вялікае княства. “Хроніка Літоўская і Жамойцкая” пад 1411 годам паведамляла, што Ягайла з Вітаўтам дамовіліся, “если бы Витолт не мел детей, а Ягейло мел, то дети его на короне Польской и на Великом князстве Литовском пановати мели, также если бы Ягейло детей не мел, а Витовт мел, теды в короне Польской и Великом князстве Литовском пановати мели”. Гэтае пагадненне на самастойнае кіраванне Княствам доўжылася больш за паўтара стагоддзя – да Люблінскай уніі 1569 года.

Ягайла быў адзіным у гісторыі чалавекам, які з Божага блаславення атрымаў усе тры



царкоўныя таінствы: хрышчэнне, шлюб і каралеўскае памазанне. Як паведамлялі летапісцы, ён "удостоился трех великих даров, которые ни одному из смертных не доставались разом в уделе." Спраўна кіраваў "непісьменны" язычнік польскай Каронай. Нават годна спрыяў навуцы і асвеце. Пра тое сведчыць хоць бы факт аднаўлення ў 1400 годзе Акадэміі ў Кракаве. Зараз Ягелонскі універсітэт з'яўляецца не толькі самым старэйшым у Польшчы, а і адным з прэстыжных у Еўропе.

Але ў жыцці эмацыянальнага Ягайлы былі выпадкі, калі ён нават адмаўляўся ад трона — каб толькі спыніць спрэчкі альбо сутычкі, каб абараніць і захаваць свой чалавечы гонар. Гатовы быў аддаць карону іншаму дастойнаму прэтэндэнту. Сам жа згодны быў вярнуцца ў Крэва, у Навагародак, у спракавечныя беларускія пушчы. Ды палякі шанавалі свайго караля, давяралі яму, спрыялі ягоным добрым справам.

## ЧАТЫРЫ ЯГАЙЛАВЫ ЖОНКІ

А вось сямейнага шчасця Ягайла не набыў. 22 чэрвеня 1399 года каралева Ядвіга нарадзіла дачку Эльжбету. Ягайла ж хацеў мець сына. Але кароткі век быў наканаваны і дачцэ. 13 ліпеня яе не стала. А праз чатыры дні памерла Ядвіга, не пакінуўшы дзяцей. Занепакоілася польская шляхта, якая была вельмі заклапочана сваімі ўласнымі прывілеямі. Каб не страціць іх, трэба было мець надзейнага спадчынніка ўлады. Таму яна вітала імкненне караля да новай жаніцьбы. Ягайла жаніўся яшчэ тройчы. Аднак шлюбы з Ганнай Цылейскай, пасля з Эльжбетай Граноўскай аказаліся няўдалымі. Яны рана памерлі, не пакінуўшы спадчынніка на каралеўскі трон.

І тады 70-гадовы кароль і вышэйшы князь жэніцца чацвёрты і апошні раз. Ягонай жонкай стала 17-гадовая княгіня Соф'я Гальшанская, апекуном якой быў друцкі князь Сямён, празваны Сякерай. Вянчаліся яны 7 лютага 1422 года ў Навагрудку, у касцёле Праабражэння Гасподняга. Сватам быў стрыечны брат Ягайлы вялікі князь Вітаўт, жонка якога даводзілася стрыечнай сястрой Соф'і Гальшанскай. Ягайла папрасіў Вітаўта: "Меў я тры жонкі, дзве ляшкі і адну немку. А цяпер прашу дамовіцца з Соф'яй, каб літоўскі род даў нам нашчадкаў". Соф'я нарадзіла Ягайлу Уладзіслава і Казіміра. Казімір з'явіўся на свет, калі каралю было 76 гадоў, але пражыў нядоўга.

І тут Вітаўт зразумеў, што пралічыўся. Калі б у Ягайлы не было сыноў, ён мог бы разлічваць на высокі каралеўскі пасад. А так шанец меў Ягайлаў сын Уладзіслаў. Тады, як сведчаць некаторыя даследчыкі, Вітаўт выступіў у нязвыклай ролі паклёпніка. На Гарадзельскім сейме ён заявіў, што Ягайла не можа быць бацькам дзяцей ад Соф'і Гальшанскай. Вакол гэтага разгарэ-

ліся сапраўды шэкспіраўскія страсці. З вялікімі намаганнямі каралеву ўдалося апраўдаць, і яна нарадзіла Ягайлу трэцяга сына. Пазней ён стаў вялікім князем і польскім каралём Казімірам IV Ягелончыкам. А Вітаўту да скону сваіх дзён давялося задавольвацца пасадай вялікага князя, хоць карона для яго была ўжо падрыхтавана. Аднак інтрыгі польскай шляхты перашкодзілі здзейсніцца каранацыйным намерам. Каралева Соф'я перажыла свайго мужа на 27 гадоў і памерла ў 1461 годзе.

Ягайла ж караляваў 48 гадоў, шмат зрабіў для карысці Кароны і Княства. Але нават у Вавельскім замку не адмовіўся ад многіх язычніцкіх звычак, не цураўся падтрымліваць праваслаўе. Не пазбыўся ахвоты насіць звычайны беларускі кажух, пацягнуты сукном. Памёр кіраўнік самай вялікай дзяржавы ў Цэнтральнай Еўропе 1 чэрвеня 1434 года, калі яму было 82 гады. Як сведчаць летапісы, Ягайла схапіў запаленне лёгкіх, слухаючы начамі спевы салаўя. Вылечыцца не ўдалося.

## ПАД ЗНАКАМ КРЭЎСКАЙ УНІІ

Крэўская унія ўмацавала змагароў супраць нямецкай агрэсіі, аб'яднала іхнія сілы. Тэўтонскі ордэн, створаны як каталіцкая рыцарска-манаская арганізацыя і дзяржава ў 1198 – 1199 гадах, вёў войны з Вялікім княствам з 1283 года да пачатку XV стагоддзя. Баявыя дзеянні працягваліся практычна бесперапынна. Толькі з 1325 па 1386 год Ордэн каля 100 разоў нападаў на тэрыторыю Вялікага княства. Калі не ўдаваліся значныя аперацыі, назойлівыя крыжакі рады былі захапіць няхай сабе замак, паселішча, умацаванне — хоць што, абы можна было рабаваць тутэйшае насельніцтва. І хоць рэлігійныя падставы для набегаў на Вялікае княства пасля Крэўскай уніі

зніклі, бо літоўскі народ быў ужо ахрышчаны, ды крыжацкія войны не спыніліся. Крыжаносцы так распеаразаліся, што безупынку нападалі на славянскія землі.

Часам, як вядома, гэтаму спрыялі і самі князі, калі вялі міжусобныя сутычкі за велікакняскі пасад. Да крыжакоў звярталіся і Ягайла, пакуль не стаў вялікім князем, і Кейстут, і Вітаўт. Дастаткова згадаць, што пасля ўцёкаў Вітаўта ў Ордэн толькі значныя паходы крыжакоў на беларускія землі адбываліся ў 1390, 1391, 1392, 1394 гадах. З дапамогай іх Вітаўт спадзяваўся атрымаць велікакняскі пасад. Аднак ён не быў да канца шчыры з крыжакамі, вёў двайную гульню. Ды лёс бацькаўшчыны ўсё ж пераважыў. За чарговую здраду Ордэн жорстка адпомсціў Вітаўту: крыжакі атруцілі двух ягоных малых дзяцей-заложнікаў. Пазней на гэткую ж ролю крыжакоў у сваіх памкненнях на велікакняскі пасад спадзяваўся князь Свідрыгайла.

Аднак пасля Крэўскай уніі ў народаў Усходняй Еўропы з'явілася надзея на перамогу над Ордэнам. Гэты спадзеў апраўдалі Вітаўт Вялікі і Ягайла. Іхняе аб'яднанае войска 15 ліпеня 1410 года пераможна завяршыла Грунвальдскую бітву. Пасля гэтага больш як 500 гадоў узброеныя германцы не ступалі на беларускія землі.

Такім чынам Крэўскі замак сцвердзіў сваю вызначальную ролю ў лёсе народаў не толькі Вялікага княства і Кароны, а і Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Ды далейшы лёс самога замка аказаўся незайздросны. Пасля страты абарончага значэння ён заставаўся яшчэ надзейным жытлом для многіх знаных асоб. Аднак разбурэнне гэтай манументальнай сярэднявечнай крэпасці дакончыла Першая сусветная вайна. Больш як 3 гады Крэва знаходзілася на лініі фронту. У замку гаспадарылі немцы. Ад ваенных дзеянняў моцна пацярпела знакамітая Княская вежа, сам замак. З ягоных сцен,

вежаў і пакояў зніклі нават прывіды. А што не здолелі вайны, тое дарабілі людзі і час.

Таленавіты творца і няўмольны знішчальнік час сваімі нястомнымі жорнамі перамалоў і велізарныя ледавіковыя валуны ў сценах Крэўскага замка, і самі легендарныя сцены. Руіны замка сёння нагадваюць разбуранае гняздо былой крывіцкай славы. Калі прыслухацца, яны шмат могуць расказаць пра дзеі даўно мінулыя, пра мужнасць і адвагу нашых продкаў, пра жорсткасць і хітрасць валадароў.

Гэта наша з табой гісторыя. Адмаўляцца ад яе не варта. Яе трэба ведаць, каб лепш і глыбей спазнаць сябе, свой род, свой беларускі радавод.

## ЗВАБЛІВАЯ МАЛАДОСЦЬ 500-ГАДОВАГА ЗАМКА

Ці здараюцца ў прыродзе парадоксы? Вядома. А ці магчымы такі цуд, каб з гадамі дадавалася маладосці? Хіба і на самай справе існуе такі маладзільны напой? Не ведаю, як наконт напою, а падобнае амаладжэнне зусім рэальная справа. Не верыце? Тады кіруйцеся да сцен і вежаў 500-гадовага Мірскага замка. З кожным апошнім годам яны становяцца ўсё больш маладымі і прыгожымі, велічнымі і высакароднымі. Можна спадзявацца, што неўзабаве цалкам набудуць той першасны юнацкі выгляд, з якім у пачатку XVI стагоддзя годна ўзнесліся над беларускай зямлёй. І як сапраўдны шляхціц, апрануцца ў строі ўсіх тых стыляў, якія закранулі яго архітэктурную сутнасць: готыкі, рэнесансу, барока. Калі шмат якія замкі Беларусі ды і Еўропы падчас свайго аднаўлення шматразова перабудоўваліся, змяняліся, то Мірскі захаваў свой першасны выгляд, сваю першаас-

нову, што робіць яго яшчэ больш каштоўным.

XVI стагоддзе было знамянальным у беларускай гісторыі. Час настойліва афарбоўваў яго гуманістычнымі колерамі, даваў магчымасць беларусам годна заявіць пра сябе. І яны рабілі гэта. У 1517 годзе з падстрэшша рук Скарынавых выпырхнула ў свет знакамітая “Біблія”. Першая друкаваная беларуская кніга, выдадзеная ў чэшскай Празе. Яна ўславіла не толькі нашага першаасветніка, а стала неаспрэчным сведчаннем таленавітасці і годнасці беларусаў, якія ўпэўнена займалі свой “пасад між народамі”, станавіліся ўпоравень з іншымі. Пазней гэты беларускі пасад дбайна ўмацаваў вялікі канцлер і таленавіты дзяржаўны дзеяч Леў Сапега. У 1558 годзе ён стварыў першы беларускі звод законаў — Статут Вялікага княства Літоўскага, які стаў неперараўзыдзеным у Еўропе прыкладам доўгачасовага прававога рэгулявання жыцця дзяржавы.

Але XVI стагоддзе было перыядам частых і зацятых ваенных сутычак, калі выпрабоўвалася загартаванасць нашых вояў-абаронцаў. Ці не таму беларускія землі мусілі ўмацоўвацца новымі замкамі і іншымі абарончымі збудаваннямі? Менавіта ў гэты час і пачалося будаўніцтва Мірскага замка — каля 1510 года.

Сярод сваіх суродзічаў ён вылучаўся тым, што гэта ледзь не самы старадаўні і першы манументальны помнік прыватнага мураванага дойлідства ў Беларусі. Калі Навагародскі, Гарадзенскі, Крэўскі замкі паўсталі як дзяржаўныя пабудовы, дык Мірскі архітэктурналандшафтны ансамбль узведзены выключна на сродкі ягоных гаспадароў. Мажліва, таму і сам замак, і палац унутры двара будаваліся і перабудоўваліся вельмі доўгі час. Практычна цягам усіх 500 гадоў не сыходзілі з яго муроў беларускія дойліды. Яны то даводзілі да ладу палац, які ўрэшце стаў трохпавярховым, то шчыравалі

над новымі ўмацаваннямі, то аднаўлялі замак пасля варожых асадаў і штурмаў.

А пачынаў будаўніцтва надворны маршалак Вялікага княства Літоўскага берасцейскі стараста Юрый Ілініч. Да ўзвядзення замка было далучана практычна ўсё навакольнае насельніцтва і найперш сяляне. Кожнаму была вызначана свая дзялянка. Адны збіралі на палях вялізнае каменне. Другія звозілі яго на будоўлю. Трэція апрацоўвалі валуны, сартавалі, падганялі адзін да аднаго. Іншыя выбіралі і секлі ў дубовых гаях найбольш гонкія і моцныя дрэвы. Нельга нават пералічыць усе віды работ і ўсіх занятых на ўзвядзенні "памяткі дзён, што ў нябыт уцяклі". Дзеля гэтага давялося нават цагельні новыя адкрываць.

Але паспешнасці і мітусні на будоўлі не было. Майстры добра ведалі сваю справу, рабілі яе годна, на вякі. Ды так, каб з першага позірку можна было пазнаць беларускую школу. Акрамя магутнасці збудаван-



ня дойліды дбалі і пра яго архітэктурную выразнасць і адметнасць, пра мастацкую аздобу. Мірскі замак вылучаўся з асяроддзя ранейшых збудаванняў сваёй цеплынёй, гармоніяй, знітаванасцю з прыроднымі асаблівасцямі. Але не было ў ім нічога лішняга. Высакароднасць і велічнасць заключалася ў прастаце, выгоднасці і функцыянальнай дасканаласці.

Калі галоўная адметнасць большасці сярэднявечных замкаў выяўлялася ў тым, каб адважваць няпрошаных гасцей, а не прывячаць жаданых і пашаноўных, то Мірскі палацава-замкавы комплекс удала паяднаў абедзве гэтыя функцыі. Шыкоўны замкавы палац быў разлічаны на багатае і размаітае княскае жыццё. Таму замак выконваў яшчэ і прадстаўнічыя функцыі як княская рэзідэнцыя. Пасля трохразовай дабудовы палац меў больш за 40 пакояў. Усе яны былі багата ўбраны і аздоблены ў стылі рэнесансу. Паркетная падлога, выключнай прыгажосці печкі і каміны з рэльефнай кафлі, каваныя з медзі падсвечнікі, каляровае шкло і вітражы ў вокнах, мноства скульптурных выяваў, разьба — усё гэта мусіла засведчыць багацце і ўладную сілу гаспадароў замка. Здзіўленне шматлікіх гасцей выклікалі калекцыі дарагой зброі, карцін, старых кніг, габелены, знакамітыя карэліцкія шпалеры.

Знешне замак таксама вылучаўся сваёй аздобай. Сцены ўпрыгожвалі два паясы арнаменту з цэглы. Пабеленыя вапнай дэкаратыўныя нішы рознай велічыні і формы надавалі яму асаблівую ўрачыстасць. Цікавымі ўстаўкамі ў сценах і вежах з'яўляліся вялізныя камяні.

Гэты гадаванец многіх дойлідавых рук натуральна ўвабраў у сябе рысы не толькі ранейшых стыляў, а і стаў прыкладам новай архітэктурнай выразнасці, заснаванай на еўрапейскім вопыце замкавага будаўніцтва.

Ад спічастых, халодных і суровых, часам нават змрочных збудаванняў ранейшага часу Мірскі замак адрозніваецца большай адухоўленасцю і прыветнасцю. Ці не таму жыхары Міра казалі, што ад увахода ў замак пачынаецца сімвалічны шлях у сталіцу Вялікага княства Літоўскага Вільню. Гэта павінна было сведчыць пра блізкасць уладароў замка да велікакняскага пасада, пра ролю палацава-замкавага комплексу ў тагачаснай дзяржаве.

Так яно было і на самай справе. Пазнейшыя гаспадары Міра князі Радзівілы, якім замак належаў каля 300 гадоў, мелі гучную славу ў Вялікім княстве і Рэчы Паспалітай як род знаны, магутны і ўплывовы ў сферы культуры, навукі, збіральніцтва, у палітычных і дзяржаўных справах. А замак ад самага свайго нараджэння стаў адметным абарончым збудаваннем. Па форме ён нагадвае чатырохвугольнік са сценамі каля 75 метраў удоўжкі і 13 метраў увышкі. Тры баявыя ярусы забяспечвалі надзейную агнявую магутнасць. На самым ніжнім узроўні размяшчаліся каля 30 байніц для гармат. Сярэдні ярус нагадваў галерэю з мноствам ружэйных байніц, з якіх можна было весці агонь як па знешніх нападоўцах, так і па тых, якім удалося б уварвацца ўнутр. Трэці ярус знаходзіўся на версе сцен. Баявой сілы замку дадавалі адзіныя на ўсю дзяржаву машыкулі — навясныя байніцы на сценах і вежах, а таксама “варавыя вокны”, адкуль на галовы ворагаў ляцелі буйныя камяні і лілася гарачая смала.

Але галоўнай адметнасцю Мірскага замка з’яўляліся, безумоўна, вежы. Яны ўзвышаліся ў чатырох вуглах, выступалі з-за сцен замка. Кожная нагадвала квадрат 10 на 10 метраў. Увышкі яны дасягалі да 25 метраў. Каб утрымаць гэткі важкі стоўп, зрабілі глыбокі, ажно на 4 метры, фундамент з вялізных валуноў. Вежы мелі 5 паверхаў рознага пры-


Мірскі замак

значэння, складаную сістэму хадоў, унутраных лесвіц і пераходаў. На ўсіх паверхах знаходзіліся гарматныя і ружэйныя байніцы. Калі ў аснове сваёй вежы нагадвалі квадрат, то з 4-га яруса ператвараліся ў васьміграннік. Кожная вежа мела сваю архітэктурную індывідуальнасць, а агульны арнамент не толькі яднаў іх між сабой, але і ўдала гарманіраваў з аздобай сцен. Усё гэта стварала непаўторны воблік і цешыла вока сваёй пекнатой і велічнасцю. Кажуць, што гэткі палацава-замкавы комплекс быў адзіны на ўсе навакольныя землі Польшчы, Расіі і Балтыйскага краю.

Але найбольш дасканалай і самай высокай была пятая, уваходная, вежа ў цэнтры заходняй сцяны. Яна мела 6 паверхаў-ярусаў, большыя памеры. У гэтай вежы знаходзіўся адзіны ўваход у замак, які ахоўвалі двое дубовых варот на моцных запорах. Для большай надзейнасці і перасцярогі ад розных нечаканасцей была змайстравана спецыяльная рашотка з завостранымі ўнізе жалезнымі палосамі. Яна называлася герсай і звычайна спачывала ў спецыяльным схове ўгары. У выпадку небяспекі імгненна падала ўніз і перакрывала ўваход альбо стварала пастку тым, каму ўдалося прарвацца за першыя вароты. У гэтай вежы знаходзілася капліца, як і ў іншых — падвальная турма-вязніца. Угары адбіваў меладычнымі звонамі мірскі час вежавы гадзіннік.

А калі пазней узброеная магутнасць захопнікаў узрасла за кошт артылерыі, уладальнікі замка мусілі зрабіць яшчэ больш надзейную ахову ўвахода. На італьянскі манер перад варотамі была збудавана вялізная паўкруглая сцяна — барбакан. Унутры яго выкапалі роў. Цераз яго быў перакінуты спецыяльны пад'ёмны мост. Калі яго падымалі, ён станавіўся яшчэ аднымі велізарнымі варотамі, акаванымі жалезам з шыпамі. Звонку перад сценамі ўзвялі спецыяльныя бастыё-



ны — умацаванні з гліны, пяску і зямлі.

Мы згадвалі ўжо італьянскія элементы ў канструкцыі замка. Гэта не было выпадковым. Адзін з яго ўладальнікаў нясвіжскі князь Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка меў схільнасці да розных нечаканых праектаў і дзеянняў. У 1583—1584 гадах ён здзейсніў паломніцтва ў Ерусалім, пра што напісаў займальны дзённік. Па дарозе наведаў Італію, дзе ў вока князю ўпала шмат што з тагачаснага замкава-палацавага будаўніцтва, з пекнай італьянскай архітэктуры. Князь "захварэў" на італьянскія манеры. А калі вярнуўся, то загадаў выпісаць з Італіі майстроў, якія не толькі ў Нясвіжскім замку, але і ва ўсім горадзе наводзілі лоск.

Выдатны архітэктар Ян Марыя Бернардоні збудаваў у 1586—1593 гадах знакаміты езуіцкі касцёл, які называецца сёння фарным. Роўных яму не было ў цэлай Еўропе. У касцельнай архітэктуры і аздобе

міжволі адбіліся тагачасныя палітычныя, рэлігійныя і эстэтычныя спрэчкі. Езуіты, якія вялі барацьбу з Рэфармацыяй, нават архітэктурнаму стылю Рэнесанса з ягонай суровай прастатой проціпаставілі больш эмацыянальнае і цёплае барока. Нясвіжскі касцёл стаў першым ва Усходняй Еўропе і другім у свеце гэтага стылю.

Пра славутага архітэктара Бернардоні гісторыя захавала нямала легенд. Кажуць, што ён меў дачыненне да будаўніцтва галоўнага храма езуітаў у Рыме Іль Джэзу, які распачынаў стыль барока. Іншыя сцвярджаюць, што Бернардоні быў знаёмы з самім Мікеланджэла і браў удзел у будаўніцтве рымскага Сабора святога Пятра. У Нясвіжы ён працаваў 13 гадоў. Дзякуючы ягоным стараннямі замак, фарны касцёл ды і сам Нясвіж сталі зіхоткімі перлінамі беларускай зямлі. Захаваліся звесткі, што Бернардоні і яго вучні мелі дачыненне і да ўдасканалення Мірскага замка. А пыхлівыя Радзівілы, як сведчаць легенды, далі майстру "вартую адплату": каб не здолеў паўтарыць нясвіжскі шэдэўр яшчэ дзе-небудзь, яго асляпілі.

Італьянскі дух запанаваў і ў Мірскім замку, які стаў на час рэзідэнцыяй Радзівілаў. За знешнім валам быў закладзены багаты "італьянскі сад", аранжарэя. Адных толькі цеплалюбівых раслін з усіх куткоў свету тут мелася больш за 400. Былі збудаваны ставы, каналы, млыны. А непадалёку з'явіўся нават звярынец, дзе жылі і вучоныя мядзведзі-акадэмікі. Бо з захопленасці Радзівілаў і з іхняй падтрымкі ў Смаргоні была адкрыта знакамітая на ўсю Еўропу мядзведжая акадэмія, дзе касалапых мішкаў вучылі на вандроўных артыстаў.

З Радзівіламі звязана і яшчэ адна цікавая старонка ў гісторыі Міра і замка. Незвычайныя запісы на ёй зрабіў знаны сваімі дзівацтвамі і штукарствам князь Караль Станіслаў Радзівіл, празваны ў народзе Пане Каханку. Ён уся-

ляк заахвочваў пасяленне ў Міры цыганоў, апекаваўся імі. Пры ім Мір стаў сапраўднай цыганскай сталіцай на ўсё Вялікае княства, а цыганы адчувалі сябе тут ледзь не галоўнымі насельнікамі.

Вядомы самы першы дакумент, які пісьмова засведчыў побыт цыганоў на беларускіх землях. Гэта прывілей вялікага князя Аляксандра Казіміравіча ад 25 мая 1501 года, які захоўваўся ў нясвіжскім архіве князёў Радзівілаў. Прывілей зацвярджае на пасадзе старшага войта, па-сённяшняму — барона, Васіля і надае яму "моц і права судзіць цыганоў і разбіраць усялякія спрэчкі паміж імі. Войт Васіль і яго цыганы ва ўсіх землях нашых Вялікага княства Літоўскага і ў яго валасцях павінны мець поўную свабоду паводле даўных правоў, звычаяў і даўных княскіх лістоў". Спасылка на "даўныя правы" і "даўныя княскія лісты" сведчыць, што цыганы і да гэтага былі звязаны з беларускімі землямі, мелі тут добрае спрыянне.

У XVIII стагоддзі яны стала атабарыліся і ў Міры, які належаў Радзівілам. Князь Караль Станіслаў Радзівіл наладжваў тут шумныя балі, гулянкі. Ён меў асаблівыя адносіны да цыганоў, захапляўся іхнімі звычаямі, падтрымліваў іх. Пане Каханку даваў цыганам прывілеі на вольны гандаль у ваколіцах Міра і Нясвіжа.

У знак асаблівай пачцівасці да смуглатварых дзяцей ветру князь увёў тытул цыганскага караля, надзяліў яго шырокімі правамі. Цікавай была працэдура выбараў. Караля выбіралі з багатых і статных цыганоў. Адбывалася гэта на Мірскім полі. Сюды з'язджаліся табары з усяго Княства. Гэта было сапраўднае шматлюднае і шматдзённае свята. Новаабранага вярхоўнага кіраўніка тройчы з радаснымі воклічамі падымалі на руках угару. Пасля падносілі розныя падарункі. Першацыган меў вялікую ўладу над сваімі суродзічамі, мог караць іх і мілаваць, чым карыстаўся поўнай мерай.

У Польшчы выбраныя цыганскія кіраўнікі атрымлівалі пацвярджэнне сваёй улады з каралеўскай канцылярыі. А ў Вялікім княстве на пасаду іх узводзілі Радзівілы. Згодна з гэтай традыцыяй, Пане Каханку сваёй граматай ад 22 ліпеня 1778 года зацвердзіў каралём цыганоў у Міры мешчаніна Яна Марцінкевіча. Гэта быў самы каларытны і няўрымслівы кароль, нястомны аматар розных штукарстваў.

На манер свайго апекуна і настаўніка Караля Радзівіла, Ян Марцінкевіч любіў правіць уладу, паказаць сваю каралеўскую мосць. Як сапраўдны кароль, ён збудаваў у Міры шыкоўны палац, дзе вясёлае жыццё віравала нібы ў шатры. На шумныя цыганскія зборы сюды прыязджалі знаныя польскія асобы, пашаноўныя госці, Радзівілы. За 12 пасадных гадоў Ян Марцінкевіч шмат натварыў дзівацтваў. Пры ім цыганская сталіца не раз звінела вясёлымі песнямі, шумела пышнымі святамі і відовішчамі. Слава пра яе разнеслася далёка па ваколіцах. Як сведчыць беларускі этнограф З. Даўгяла, апранаўся кароль модна, замест шаблі насіў бізун. “Калі трэба было яму ехаць, то звычайна ўперадзе ехалі дзесяць спевакоў з кіраўніком (паўкерам), які біў рэмнем па кацялках. За спевакамі ехаў сам кароль на добрым кані, вельмі хораша прыбраным. Ззаду за ім — сем цыганоў у рознакаляровым убранні. За імі вялі некалькі троек парожніх коней. Затым, у старасвецкім рыдване, які быў вымаляваны ў пунсовы колер, ехала каралева на васьмёрцы коней”.

Захаваліся звесткі, што кароль любіў катацца ў пазалочанай карэце, запрэжанай дванаццаццю коньмі. Суправаджаў яе вялікі і размаіты натоўп рознага служылага каралю люду, коннікі. Гэткую ж світу меў ён і падчас пешых праходак. А сустрэчныя цыганы мусілі ў пакорлівай схіленасці вітаць свайго Бацю Яна.



Марцінкевіч быў апошнім цыганскім каралём у Міры. Пасля смерці Яна трон атрымаў яго сын, які неўзабаве кінуў-рынуў усё набытае і вольным ветрам разам са сваімі суродзічамі паляцеў у Турцыю. Тыя ж, што засталіся ля замкавых сцен, стваралі свае суконныя, ткацкія і скураныя мануфактуры, якія праславіліся на ўвесь край. Цыганскае палатно вызначалася добрай якасцю і носкасцю. У многіх міран доўга захоўвалася гэтае ткацтва. З яго нават шылі царкоўныя шаты. А пра не вельмі сумленных людзей хадзіла прымаўка: “Майстар з Міра, што цяў, то й дзіра”.

Калі не стала цыганскага караля, знікла патрэба і ў цыганскай рэзідэнцыі. Аднак багаты рыштунак з палаца Яна Марцінкевіча да самага пачатку XX стагоддзя захоўваўся ў Мірскім замку.

Праславіўся Мір сваімі шматлюднымі конскімі базарамі. Сюды збіралася гэтулькі народу, што мясцовыя жыхары

жартавалі: з-за коней і цыганоў свету божага не відаць. Часта купля-продаж абрастала такімі пацешнымі абставінамі, што нагадвала дзівосную забаву, паглядзець на якую збіраўся цэлы натоўп. Здатнымі майстрамі аказаліся аселыя цыганы ў гадоўлі мядзведзяў. Займаліся яны і кавальствам, слясарнай справай, выразалі з дрэва. Яшчэ мо і сёння ў жыхароў Міра захоўваюцца іхнія драўляныя сальніцы, бочкі, дзежкі, міскі, дзіцячыя цацкі і іншыя вырабы.

Такая вось “цыганская” старонка ў гісторыі Міра. Спрычыніліся да яе багатыя, вясёлыя і санавітыя Радзівілы, шматгадовыя гаспадары Мірскага замка. І толькі ў 1812 годзе яго ў Радзівілаў адабралі. За тое, што ў вайне з Напалеонам сталі на бок французаў. У падтрымку Напалеона выступіў нясвіжскі князь Дамінік. Гэта ён паспеў схаваць галоўныя замкавыя каштоўнасці, калі адчуў, што хутка ў Нясвіж увойдуць царскія войскі. А вось дзе схаваў, невядома і дагэтуль, бо тайну забраў з сабой Дамінік, які загінуў у адным з баёў. Ён жа схаваў і славутыя залатыя скульптуры 12 апосталаў, якія мелі амаль чалавечы рост. Дзе іх толькі не шукалі і не шукаюць дагэтуль. У Нясвіжскім і Мірскім замках, у іхніх ваколіцах. Але таямніца не даецца ў рукі. Кажуць, што апосталы самі перахоўваюць схаванае і аб’яўляцца людзям толькі тады, калі адчуюць, што надышла спрыяльная пара. Цяпер Нясвіжскі замак стаіць на парозе грунтоўнага і сур’ёзнага аднаўлення і рэстаўрацыі. І, магчыма, апосталы чакаюць, калі зноў пачне дзейнічаць падземны ход з Нясвіжа ў Мір, па якім Радзівілы любілі катацца на мядзведзях. Тым больш што ў Мірскім, відаць, дагэтуль захавалася шмат яшчэ не даследаваных лёхаў і падзямелляў. Авось пашанцуе? І тады не толькі з’явяцца залатыя апосталы, але і ўсе зніклыя багацці Радзівілаў. А ранейшы падзем-

ны мядзведжы шлях ператворыцца ў ажыўлены турыстычны маршрут. Засталося зусім мала — стварыць неабходныя ўмовы апосталам, задобрыць іх ды давесці да ладу Нясвіжскі і Мірскі замкі.

Ва ўсе часы існавання Мірскага замка ягоныя гаспадары мелі яшчэ адну адметнасць — небывалую пыху. Гэта датычыцца і першабудаўніка замка, і ягоных пазнейшых гаспадароў Радзівілаў, і нават самага апошняга ўладальніка — былога царскага дыпламата князя Міхаіла Святаполк-Мірскага. Але пачатак гэткай пыхлівай ганарлівасці ўсё-ткі паклаў Юрый Іллініч. Раней часта ставілася пытанне: як мог узнікнуць замак на даволі бяспечнай прасторы, не на ажыўленым скрыжаванні ваенных дарог, у адносна спакойны час. Ды і сам фундатар быў не надта багаты, каб узводзіць за свае грошы гэткае манументальнае збудаванне. Акрамя іншых прычын на першае месца ставілі моцнае жаданне Ілініча вылучыцца, атрымаць прызнанне і павагу ў высокім асяроддзі. Гэта ўсяляк падтрымліваў пазнейшы апякун малалетняга ўнука першабудаўніка, таксама Юрыя, нясвіжскі князь і будучы вялікі канцлер літоўскі Мікалай Радзівіл Чорны. Імкненне да самасцвярджэння і самаўзвелічэння вылілася ўрэшце ў атрыманне ў 1553 годзе тытула графа Свяшчэннай Рымскай імперыі. А замак стаў цэнтрам Мірскага графства.

Пазней граф Юрый Ілініч пераказаў мірскія ўладанні сыну свайго апекуна Мікалаю Крыштофу Радзівілу, які і закончыў трэці этап будаўніцтва палаца. У гэткай пекнай рэзідэнцыі можна было прымаць і вельмі высокіх гасцей. Захаваліся звесткі, што не толькі Нясвіж, але і Мір наведаў у 1705 годзе апошні польскі кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Ён гасціў тут у князя Пане Каханку. Але гэта быў трывожны час у гісторыі Рэчы Паспалітай. Таму вядомы да-



следчык і гісторык Ю. Ядкоўскі трохі іранічна зазначаў, што гэтае гасцяванне праходзіла ў крывавым зарыве польскай гісторыі, якая хілілася ўжо да свайго скону. А гэтыя moriturі за бесклапотным частаваннем нават не заўважалі, што рука лёсу крэсліць ужо свой суровы вырак, што лічаныя дні адпушчаны і замку, і каралю, і польскай дзяржаве.

Так яно ўрэшце і сталася. Шматлікія ваенныя падзеі паступова падрывалі баявую магутнасць замка, нішчылі яго ролю ў гісторыі краю. Пацярпеў замак ад царскага войска, ад шведскай аблогі. Яго штурмам узяў у 1706 годзе шведскі кароль Карл XII. Спыніўся знакаміты мірскі гадзіннік, які апошні раз у 1686 годзе адрамантаваў таленавіты майстар Юцэвіч. Усё дачыста было паламана, зруйнавана і выгарала падчас пажару. Але найбольшыя разбурэнні напаткалі замак у час вайны з Напалеонам.

Пасля гэтага змяніліся і гаспадары замка. Мір і Нясвіж былі аддадзены Антонію Радзівілу. Іншыя ўладанні дасталіся дачцэ апальнага Дамініка і выхаванцы імператара Стэфаніі. Каб захаваць радзівілаўскія ўладанні, яна намервалася выйсці замуж за аднаго з Радзівілаў, які жыў у Берліне. Аднак высокі апякун не мог гэтага дазволіць, помсцячы за здраду Дамініка, які ваяваў на баку французаў. У 1828 годзе Стэфанія выйшла замуж за царскага ад'ютанта князя Людвіга Вітгенштэйна, якому і стала належаць Мірскае графства. Аднак замкам новы гаспадар не апекаваўся. Былая вялікалітоўская памятка і велічны помнік беларускага абароннага дойлідства прыходзіць у заняпад.

Калі ў 1853 годзе яго пабачыў Уладзіслаў Сыракомля, ён сумна пісаў: "...устае ва ўсёй велічы сваіх руінаў Мірскі замак... Руіны з чырвонай цэглы прыгожа глядзяцца на зялёным фоне даўніх валоў і



блізкага саду. Гнёзды буслоў на вежах па-асабліваму і вельмі добра аздабляюць тое, што засталося ад замка, — яму, нягледзячы на моцныя яшчэ сцены, ужо ніколі, мусіць, не ўваскрэснуць".

Аднак памыліўся знаны літаратар і даследчык даўніны. У 1891 годзе князь Мікалай Святаполк-Мірскі купіў замак у князя Л. Вітгенштэйна. У 1904 годзе ў парку была збудавана капліца-пахавальня, на якой захавалася маляўнічае пано з выявай Спаса.

Сын Мікалая, расійскі дыпламат Міхаіл, пасля рэвалюцыі 1917 года аказаўся без пасады і прыехаў у Мір. З 1921 года ён стала жыў у замку. Апошні яго ўладальнік сівабароды Міхаіл Святаполк-Мірскі (памёр у 1938 годзе), як расказваюць людзі, быў трохі дзівакаватым і дзікаватым князем. Жыў ён адзінока ў адной з вежаў, стварыў там сапраўды сярэднявечную абстаноўку, нікога не прымаў, ні з кім не сустракаўся. Аднак

пры ім пачалося найбольш актыўнае аднаўленне старадаўняй памяткі. Ён так актыўна распачаў аднаўленчыя работы, што замак на вачах мяняў сваё аблічча. Упарадкаваў новы гаспадар і наваколлі.

У час Вялікай Айчыннай вайны ў замку знаходзілася яўрэйскае гета. У "італьянскім садзе" было расстраляна некалькі тысяч бязвінных ахвяр.

А знявечаны вайной старадаўні замак на доўгі час даў прытулак гэткім жа знявечаным мясцовым жыхарам і бежанцам. Аж да пачатку 1960-х гадоў жылі ў ім людзі.

Зараз гэтая неацэнная перліна беларускай зямлі стараннямі дзяржавы аднаўляецца. Неўзабаве заззяе замак усімі сваімі шматсотгадовымі фарбамі і аздобамі. А за свой маладзецкі выгляд і за стараннасць рэстаўратараў у 2000 годзе ён унесены ЮНЕСКА ў спіс сусветнай культурнай спадчыны як з'ява неацэннага гістарычнага багацця.

# 2

# Відавочнае — неверагоднае



*Яраслаў ПАРХУТА, пісьменнік*

## САМАЕ ГЛЫБОКАЕ

Спачатку слова доктару геаграфічных навук Вользе Піліпаўне Якушка. У сваёй кніжцы "Край азёрны" яна расказвае пра сустрэчу з возерам Доўгім — самым глыбокім у Беларусі, якое знаходзіцца ў Глыбоцкім раёне, — наступнае.

"Гэта былі яшчэ надзвычай цёплыя дні — апошнія дні лета, ледзь кранутыя сумам блізкай восені, — піша Вольга Піліпаўна. — Раніцой выбіраліся мы са свайго самаробнага будана, узведзенага пад адзінокай старой ялінай, і беглі па слізкай ад расы траве ўніз па крутым схіле возера. Туман ахутваў яго так, што цяжка было нават разглядзець цёмныя сцябліны чароту. Пасля халоднай расы вада здавалася гарачай, і было прыемна стаяць нерухома ў гэтай цёплай ванне, прыслухоўвацца да ранішніх гукаў. Яны прыходзілі адусюль: гэта былі галасы рыбакоў, што праплывалі на лодках недзе каля нас пасля начнога лову, брэх хутарскога сабачкі з процілеглага берага, стук шышкі, што сарвалася з яліны. Туман не толькі глушыў гукі, але як бы размяркоўваў іх у прасторы так, што галасы з вёскі, здавалася, чуліся недзе побач, а ранішняя песня жаваранка даносілася аднекуль здалёк..."

І далей Вольга Піліпаўна піша пра тое, таямнічае, схаванае ад людскіх вачэй:



"Ад тубыльцаў можна пачуць, што глыбіня возера не меней 70 сажняў, што на дне яго ёсць высокія горы, у ямах водзяцца пачвары, а снятку — процьма. І ў гэтым шмат праўды: ну што з таго, што глыбіня возера не 70 сажняў, а 53 метры, што глыбакаводныя пачвары так і не паяўляліся. Але паўпудовы шчупак, выцягнуты з вады на нашых вачах, вельмі падобны быў на кракадзіла, а метровы вугор нагадваў вялікага пітона. Хаця ў возеры водзяцца розныя пароды рыб, удача не часта спадарожнічала рыбакам: вельмі складанае азёрнае дно".

Дае яна і больш канкрэтнае апісанне возера Глыбокага: "Уражвае перш за ўсё сваёй формай. Яно нагадвае вузкую (300 – 350 метраў) цясніну даўжынёю каля 7 кіламетраў з высокімі, амаль стромымі схіламі. Вялікая круцізна характэрная і для падводных схілаў. Толькі вузенькая мелкаводная пясчаная палоска цягнецца ўздоўж берага, а далей — рэзкі спад адразу на 15 – 18 метраў, куды не даходзяць промні сонца. У цэнтры возера глыбокія, па 40 – 50 метраў, плёсы раптоўна чаргуюцца з падводнымі ўзвышшамі-перакатамі..."

Вось якое яно, возера Доўгае! Дзіва што здаўна прыцягвала да сябе чалавека. Шмат стагоддзяў таму назад у ваколіцах Доўгага з'явіліся славянскія плямёны крывічоў. Звыш дваццаці курганоў за апошнія гады выяўлена толькі каля вёскі Бабруйшчына. Ёсць старадаўняе гарадзішча непасрэдна і на беразе возера — на паўвостраве Галубоў Хутар. Адны сцвярджаюць, што гэта след першабытнага пасялення чалавека, другія — колішняга пасялення крывічоў. Аднак раскопак тут ніхто не рабіў, і можна толькі гадаць, што ўяўляе сабой тое гарадзішча. Недалёка адсюль, на беразе суседняга возера Шо, паблізу вёскі Сшо, было таксама старадаўняе пасяленне. У 1928 годзе польскія вучоныя Ева і Пётр



Галубовічы правялі там археалагічныя раскопкі. Знойдзены каменныя прылады, тыповыя прадметы ўжытку крывічоў. Пазней, пасля вайны ўжо, каля вёскі Свіла старажытнае гарадзішча даследаваў вядомы беларускі археолаг Аляксей Рыгоравіч Мітрафанаў. Ён выявіў шмат цікавага. Быў знойдзены і гаршчок з жытам, які праляжаў у зямлі за тысячу гадоў. Гэта сведчыць, што жыхары старадаўняга селішча былі людзьмі аселымі. А дзівіла іншае: зярняты прараслі і далі ўсходы!

Возера Доўгае прыцягвала да сябе людзей і пазнейшага часу. Сюды сходзіўся, з'язджаўся народ з далёкіх і не вельмі далёкіх мясцін, будаваўся і жыў з працы рук сваіх на яго берагах. Вакол выраслі вёскі — Каменка, Заазёрная, Доўгае, Новая Псуя, Абруб, Стуканы, Зябкі Псуеўскія.

Цікавая гісторыя засялення паўднёвага, самага ўзгорыстага берага возера. Жыхары далёкай па тым часе Мядзельшчыны дачуліся, што бераг Доўгага не абжыты, што там куды лепшая зямля за іхнюю, і рашыліся на перасяленне. (Гэта было перад уз'яднаннем Заходняй Беларусі.) Туды пераехалі сем'і Чарняўскіх, Давідовічаў і ажно чатыры сям'і братоў Малькоў: Юстына, Івана, Андрэя і Мікалая. Зляпілі часовыя хаціны і сталі даводзіць да ладу зямлю — карчаваць лес, выпальваць ляда, матычыць. Толькі пасля такой "апрацоўкі" можна было плуг пусціць. Зямля суглiністая, цяжкая, але радзіла спраўна. Хіба толькі як падкралася засуха, перасяленцы амаль нічога не мелі. Зямля камянела ад сонца і была голай, што бубен. Тады людзей выручала возера.

Я сустрэўся з сынам Юстына-перасяленца Пятром Мальком. Ён сказаў:

— Помню, у гады няроду ўсе нашы на возеры прападалі. Стынку лавілі, гэта значыць снятка. Яе і смажыць можна было, і сушыць. Таксама ляшча бралі, акуня, карася, шчупа-

ка. Іншы раз на вугорыча натрапяць, то тады ўжо як свята было. Вугорыч, ведаеце, на сваім тлушчы смажыўся.

— А стынка? Якая яна сабою?

— На мойву падобная. Пах мае спецыфічны і на сонцы ажно прасвечваецца, як шкляная. Цяпер, улетку, яе не ўлавіць: на вялікіх глыбінях трымаецца.

— А вугор?

— Пра вугорыча нешта не чуваць зараз. Пэўна, недзе на падыходах запынь узвялі і ён трапіць не можа ў Доўгае.

Пятро Юстынавіч трывожыўся недарма. Каб маляўкам вугра дабрацца да возера, трэба прайсці з Саргасава мора (там адзіныя ў свеце нерасцілішчы вугра) даволі складаны шлях: Балтыйскае мора — Заходнюю Дзвіну — рэчкі Дзісненку і Мнюту — возера Плісы — рэчку Шоша — возера Шо — рачулку Даўжанку. Відаць, недзе сапраўды ёсць перашкода, а мо і не адна. Гэта можа быць плаціна або шлюз. Адным словам, нашым рыбаводам варта выявіць сапраўдную прычыну, якая шкодзіць міграцыі вугра.

Але Пятру Юстынавічу я сказаў пра іншае:

— Тут жа ў вас прыгажосць якая! Возера непаўторнае. Відаць, і гэта паспрыяла таму, што Доўгае аб'яўлена заказнікам дзяржаўнага значэння.

— А як жа! — выказаў ён згоду. — Толькі, думаю, во якая асноўная прычына будзе: у Доўгім да нашых дзён з ледніковага перыяду захавалася нейкая дзіўная водарасць. Пра стынку я казаў ужо, а пра рачка і водарасць — нічога канкрэтнага паведаміць не магу. Памятаю толькі: у пяцідзесятых гадах возера даследавала адна вучоная з Мінска, Якушка яе прозвішча. То ўсё, помню, не магла нарадавацца і тымі рачкамі, і тымі водарасцямі.

Я здагадаўся, пра якога рачка і пра якія водарасці казаў Малько.

Рачок той называецца лімнакалянус. Ён сапраўдны рэлікт



ледніковага перыяду. Занесены ў Чырвоную кнігу. Захаваўся ў Доўгім толькі дзякуючы чысціні вады і глыбіні возера. Сам — драбней ці знойдзеш. Даведнікі сцвярджаюць, што ў кубічным метры вады ў натуральных умовах гэтых рачкоў можа жыць да трыццаці тысяч асобін. Вядома, убачыць такога "велікана" ды яшчэ няўзброеным вокам Малько не мог, а вось сустракаць незвычайныя водарасці, магчыма, і даводзілася.

Вольга Піліпаўна Якушка пра тыя водарасці (па-навуковаму — асцыляторыя чырванаватая) расказвае ў той жа кніжцы: "Аднойчы на пачатку сакавіка нашу экспедыцыю чакала цікавае адкрыццё. Выявілася, што насуперак устарэлай думцы аб слабым развіцці водарасцяў у Доўгім, яно "цвіце", толькі не ўлетку, як іншыя, а ў канцы зімы. У тыя сакавіцкія дні лёд на возеры яшчэ быў тоўсты, але празрысты. Праз яго прабіліся сонечныя праменні і выклікалі жыццё мікраскапічных водарасцяў, якія ўтвараюць скапленні з соцень тысяч маленькіх раслін ярка-чырвонага колеру. У час работы мы раптам са здзіўленнем і захапленнем заўважылі скрозь лёд буйныя чырвоныя кветкі, падобныя на марозныя ўзоры на вокнах. Мы разбілі лёд, кветкі зніклі, але ў лунках з'явіліся скопішчы ярка-чырвонага рэчыва, якое нагадвала кавалачкі поўсці, што плавала ў вадзе. Такія водарасці сустракаюцца рэдка. У Беларусі яны вядомы ў невялікім, але глыбокім возеры Рудакова (яно ў Мядзельскім раёне — Я. П.). Пасля таго як сыдзе снег, водарасці знікаюць да наступнай вясны, нібы падснежнікі ў лесе".

— Пра наша возера шма-ат можна расказаць, — у роздуме прамовіў Малько. А вось каб сваімі вачыма пабачыць! На ўсё жыццё запомнілася б. Агледзіны пачаў з самага высокага месца на беразе возера. Некалі тут жылі Чарняўскія. Аралі

зямлю, сеялі жыта, садзілі бульбу. Яны даўно ўжо пераехалі ў вёску Абруб, а ўрочышча так і завецца ў памяць перасяленцаў — Чарняўшчына.

Адсюль, па правую руку, адзін за адным збягаюць пагоркі аж да небакраю. Усе яны ўкрыты зялёнай коўдрай травы. Хлебаробы разумеюць:

Доўгае і прылежныя плошчы трэба аберагаць — заказнік жа!

Там на подступах да возера зямлю не чапаюць, не сеюць там ні збожжавых, ні прапашных, не прымяняюць гербіцыдаў, тукаў.

Паўночны бераг возера — гэта ўжо тэрыторыя саўгаса імя Дзяржынскага. Там таксама віднеецца зялёнае мора травы. Ад самай кромкі вады падымаецца лісцевы лес. Ён звілістай фальбонай цягнецца ад нейкай вёсачкі на ўсход, толькі сям-там трошкі адступаючы ад возера.

А што каля кромкі вады тут, насупраць Чарняўшчыны? Прадзіраюся зараснікамі ўніз. Траву, кусты, дрэвы — усё перавіў хмель. Ён драпае адзежу, рукі, твар. Але каб ужо і хацеў спыніцца — нічога не атрымалася б: неяк раптоўна пачаўся амаль стромы схіл. Хапаюся за вецце, каб не паляцець у прорву, і яно выручае, утрымлівае.

Ногі ступілі ў нешта слізкае і халоднае. Ручаінка! Яна збягае ўніз, да возера, вузкім каснічком. Пераступіў яе, прайшоў трошкі ўздоўж схіла, трымаючыся за кусты, і яшчэ на адну ручаінку натрапіў. Яна шырэйшая і не такая звілістая. Дабегла да кромкі вады і знікла — злілася з возерам.

Мацаю нагою азёрнае дно. Яно цвёрдае, жвіраватае. Вада светлая — усе каменьчыкі відны. Іду ўправа, паўз самы бераг, да грыўкі чароту. Пасярод яе ляжыць круглы і пляскаты камень, а на ім нешта паблісквае чорнае... Гэта вуж выгравaецца! Скруціўся ў тры пагібелі і хоць бы што — спіць.

Падымаю з вады сук і, намацваючы дно, кіруюся далей



да берага. Але крокаў праз дзесяць адмаўляюся ад такой задумы: сук раптам не дастаў дна! Побач была бездань. Успомніліся словы Малька: “Насупраць Чарняўшчыны – адзін з самых глыбокіх участкаў возера! Ён і замярзае найпазней. Іншы раз і сярод зімы ў гэтым месцы стаіць туман. Возера паруе, і мароз ніяк не можа ўзяць верх над ім. Глыбіня!”

А вось і ўрочышча Юстынава. Схілы мае болей пакатыя, а лес – адны прагалы. На тых касагорыстых прагалах безліч красак. Здаецца, усе, якія ёсць на зямлі колеры, сабраны там. Ні даць ні ўзяць – луг альпійскі.

Сяліба Юстына Малька яшчэ захавалася. Да апошніх дзён жыў тут гаспадар, не кінуў наседжанага месца, хоць да сяла адсюль і далекавата. Сваімі ж рукамі тут некалі і ляда карчаваў, і хаціну ставіў, і іншыя гаспадарчыя пабудовы ўзводзіў. Час няўмольны – падгнілі ўжо падрубы, пакасіліся сцены, падгніў дах. Здзічэў і садок. Яблыні пагнала ў атожылкі, кроны загуслі, і толькі зрэдку можна ўбачыць завязь, пабітую даўганосікам... Пакрыўся ржою нікому ўжо непатрэбны плужок, разваліўся вулей... Нават спрадвечныя спадарожнікі чалавека – вераб’і – пакінулі Юстынаву сялібу... З’явіцца аднойчы Пятро, разбярэ хату на дровы, пераарэ трактарам дворышча, і будзе тут такое ж поле, як і на хатнішчах астатніх перасяленцаў.

У той дзень мне давялося трапіць яшчэ і ва ўрочышча Дубы, што на тым, паўночным, беразе возера Доўгае. Кажуць, даўней вакол дрымучыя лясы стаялі. Шмат было і дубу, таму і ўрочышча так завецца. Але ўсё мяняецца. Лясы перасталі быць дрымучымі, зніклі дубровы. Толькі пра тое, што яны тут былі, сведчыць наступнае. Калі ў ціхую пагоду адплыць метраў дзесяць ад берага, то можна ўбачыць у возеры счарнелыя ад часу камлі таўшчэзных дубоў. Іх, верагодней за ўсё,

некалі паваліла бура. Відаць, не адно стагоддзе ляжаць яны ў вадзе, бо на беразе ніякага знаку — ні каранёў, ні пнёў іхніх. Знаходзяцца смельчакі, што, даўшы нырца, робяць спробу дабрацца да дубоў-тапельцаў. Аднак марна. Глыбіня там вялікая, і дубы як бы ўніз кронамі стаяць.

Вяртаўся ў вёску Псуя, цэнтр калгаса “Яблынька”, дзе знайшоў прыстанішча на тыя дні, і ўсю дарогу быў пад уражаннем сустрэчы з возерам. Нездарма мясцовыя людзі называюць яго “наш Байкал”. Па чысціні вады і глыбіні, сапраўды, возеру Доўгае няма роўных не толькі ў Глыбоцкім раёне, але і ў Беларусі. Вось жыў бы, думалася, Язэп Драздовіч, самабытны мастак-падзвіжнік, вечны вандроўнік, цікавейшы чалавек свайго часу, гордасць беларускай зямлі — абавязкова яшчэ і яшчэ прыйшоў бы на бераг Доўгага, каб зрабіць эцюд з натуры, а потым напісаць на кужалі ці зрэб’і насценны дыван — “беларускі габелен”. Такі дыван давялося пабачыць у тутэйшым школьным музейчыку. На чорным фоне — выява часткі возера, масток, перакінуты з берага на бераг, дзве маладыя жанчыны, што ідуць к мастку насустрач адна адной... Падалося, што Драздовіч узяў за аснову краявід аднаго з усходніх заліўчыкаў возера Доўгае.

# 3

# З Чырвонай кнігі Беларусі



*Уладзімір ЯГОЎДЗІК, пісьменнік*

# АДМІРАЛ І ЯГО КАМАНДА

## АДМІРАЛ

Хто сказаў, што Беларусь не марская дзяржава? У нас таксама ёсць адміралы. І самы вядомы з іх — матылёк адмірал.

На аксамітна-чорных крылах адмірала, быццам на строгім марацкім кіцелі, яскрава пунсавеюць чырвоныя стужкі, якія відаць здалёк. Яны перакінуты цераз пярэднія крылы матылька пасярэдзіне, акурат як цераз плячо. Яшчэ дзве стужкі шырокімі чырвонымі лампасамі ляжаць па краях задніх крылаў.

Аднак, нягледзячы на такі ваяцкі выгляд, наш адмірал зусім не ваюе з дрэвамі. А сталоўкаю яго чорным вусеням служыць чартапалох-татарнік ды крапіва. Хіба што ў канцы лета гэты матылёк наведваецца ў сады, бо надта любіць пасмактаць сок пераспелых сліў і груш, асабліва паданак.

Калі я сустракаюся з адміралам, дык адразу думаю пра будучыя вандроўкі па роднай зямлі і за яе межамі, пра што так хораша марылася ў незваротна-імклівым дзяцінстве.

Чэсць табе, адмірал!

## ПАВІНАЕ ВОКА

Аніводзін з нашых матылькоў не ўмее так здзіўлена і трошкі палахліва глядзець вакол сябе, як павінае вока. Дарэчы, плямак-вачанят у яго


Махаон

ажно чатыры: два — на пярэдніх крыльцах і два — на задніх. Менавіта яны і далі такое незвычайнае імя свайму ўладальніку, бо здалёк падобныя на дзівосныя кропелькі, рассыпаныя на пер'ях славутай прыгажуні павы.

Як вядома, павы на Беларусі не жывуць. Затое павінае вока сустракаецца паўсюдна, пачынаючы з ранняй вясны і да позняй восені. Вусені гэтага матылька звычайна трымаюцца на калючцы-крапіве, іншым раслінам яны не шкодзяць.

Асабліва нястомна пырхаетанцуе павінае вока сонечным лагодным ранкам. Матылёк пералятае з кветкі на кветку, то складвае, то зноў раскладвае свае зіркатыя крыльцы, нібыта просіць:

— Спыніцеся хоць на хвілінку! Паглядзіце, якое навокал хараство! Паслухайце музыку спелага лета...

Бачыце, як блізка ад некранутай яшчэ касой травы-муравы да беласнежных аблокаў?

Чуеце, як трывожна гайдаецца разам з намі планета Зямля?

**МАХАОН**

Махаон — адзін з самых вядомых і вялікіх матылькоў, што сустракаюцца ў Беларусі. Размах яго крылаў дасягае 9 сантыметраў. А падобны ён на сонечнага зайчыка, які весела скача над ляснымі палянамі, узлескамі, лугамі, дзе водзяць карагоды кветкі.

Калісьці ў некаторых мясцовасцях, расказваў мне сябар мастак, гэтага матылька яшчэ называлі гусарыкам. Бо надта ж фацэтна выглядаюць на яго задніх залаціста-чорных крылах доўгія вузкія хвосцікі, падобныя на шпоры ў ботах колішніх гусараў. Мабыць, яны сапраўды дапамагаюць прыгажуну імкліва лётаць — толькі паспявай сачыць за ім вачыма.

Не так даўно махаон быў даволі шматлікі, нават паблізу ад вялікіх гарадоў, аб чым усцешана паведамлялася ў газетах і навуковых кнігах. Аднак сёння, калі я пішу пра яго, матылёк нерухома глядзіць на

мяне з малюнка на старонцы сумна вядомай Чырвонай кнігі.

Значыць, па-ранейшаму штосьці не так у нашых стасунках з Прыродай. І страшна падумаць: няўжо неўзабаве наступіць дзень, калі наша зямля застанецца без жывога сонечнага зайчыка?

## КРАПІЎНІК




Яшчэ паўсюль ляжыць снег, толькі на паўднёвых схілах пагоркаў з'явіліся невялікія праталіны. Ноччу і раніцай не на жартачкі кусаецца мароз — верны служка цётухны-зімы. Затое днём, калі ў бяздонным яркім блакіце залатою кветкаю цвіце сонца, з кожнай хвілінай усё дружней, шырэй гучыць пераможная музыка вясны. Гэта на зямлі звіняць ручайкі, а ў небе — першыя птушкі, што вяртаюцца з выраю,— жаўрукі, зяблікі, шпакі...

І пад іх натхнёныя галасы на зацішнай сонечнай палянцы ці ў тваім двары, быццам карычневы агеньчык, радасна пырхае-танцуе матылёк-крапіўнік.

Няўжо ён таксама прыляцеў аднекуль з-за мора-акіяна?

Ды не, сябры, крапіўнік зімаваў разам з намі на Беларусі. Доўгія месяцы бесклапотна спаў у якой-небудзь цёплай шчылінцы пад карой дрэва або на гарышчы будынка. Але дыхнула цяпло — і ён тут як тут, першым з матылькоў вітае вясну-красну. Ну а потым, калі вырасце добра вядомая ўсім жыгучка, крапіўнік адкладзе


Жалобнік
Павінае вока

на яе лісце яйцы. Неўзабаве з іх з'явяцца чорныя з жоўта-зялёнымі палоскамі вусені, для якіх крапіўнае лісце — любімы ласунак. Затым вусені ператворацца ў кукалкі, яшчэ праз два тыдні, ужо ў канцы лета, з іх зноўку з'явяцца матылькі. Якраз яны і застануцца на чарговую зімоўку. Вось якое атрымліваецца цікавае жыццёвае кола.

Крапіўнік — даволі распаўсюджаны матылёк, таму на яго амаль ніхто не звяртае ўвагі. Можа, і да лепшага. Аднак не трэба забывацца: дзівоснае — заўсёды побач з намі.

### ЖАЛОБНІК

З-за вялікіх аксамітна-цёмных крылаў гэтага матылька называюць жалобнікам. І сапраўды: здалёк ён выглядае самотна. Разам з тым крылы жалобніка нібы акаймаваны сонечнымі промнямі. Перад імі нанізаны блакітныя пацеркі, падобныя на кропелькі веснавога яркага неба. Хараство — не адвесці вачэй. А вось імя мастака, што стварыў такі цуд, я не буду казаць: яно ўсім добра вядома.

Зімуе жалобнік, як і яго брат крапіўнік, у шчыліне, куды не можа залезці злюка-мароз. Падзьме вецер-веснавей — матылёк прачынаецца і пакідае схованку. У канцы сакавіка і ў красавіку ён плаўна кружыцца каля бяроз, бо надта любіць пасмактаць салодкі сок. Што ж, не дзіўна, шмат каму даспадобы бярозавік. Дарэчы, і мне таксама. Няма на свеце смачнейшага пітва, хіба кляновік можна з ім параўняць.

Потым чорна-сінія вусені, якія выведіся з адкладзеных яец жалобнікам, нястомна грызуць маладзенькае лісце бяроз, тапаляў і іншых дрэў. Канечне, яны шкодзічаюць, але трэба прызнаць — ненаўмысна. Каб акукліцца і вывесці новае пакаленне матылькоў, ім патрэбна ежа.

Намнога больш чыняць бяды маладому лесу і пракаветнай пушчы двухногія чалаве-

кападобныя істоты. Паўсюль бачны іх чорныя сляды, зробленыя пілою і сякераю, пазначаныя горбамі смецця, жахлівымі зеўрамі выжарын, узніклых ад кінутай запалкі...

Ці не таму апрануў на сябе жалобную манаскую сутану жалобнік?

### БЛАКІТНІК




Сярод вядомых мне вершаў, прысвечаных матылькам, гэты верш — адзін з самых узнёслых і дасканалых. Я запомніў яго даўно, яшчэ калі быў няўрымслівым шкаляром. Спадзяюся, вы таксама не забылі радкі, напісаныя Максімам Багдановічам:

Па-над белым пухам вішняў,
Быццам сіні аганёк,
Б'ецца, ўецца шпаркі, лёгкі,
Сінякрылы матылёк.
Навакол усё паветра
Ў струнах сонца залатых, —
Ён дрыжачымі крыламі
Звоніць ледзьве чутна ў іх.

Які цудоўны паэтычны малюнак! Адразу, быццам наяву, перад вачыма паўстае веснавы, сапраўды святочны дзень. Калі навокал смяюцца кветкі, спяваюць птушкі, танцуюць матылькі...

"А вось цікава, — неяк падумалася мне, — якога дакладна з матылькоў прыкмеціў паэт "па-над белым пухам вішняў"?"

Паразважаўшы, я прыйшоў да наступнай высновы.

Максім Багдановіч хутчэй за ўсё меў на ўвазе блакітніка. У нас на Беларусі сустракаюцца блакітнік прыгожы і

блакітнік серабрысты. Абодва матылькі невялічкія памерам і распаўсюджаны паўсюдна. Асабліва там, дзе цвіце канюшына ці люцэрна. Дарэчы, побач з блакітнікамі пырхаюць і цёмна-бурыя матылёчкі. Так сціпла ў параўнанні з самцамі пафарбаваны іх самачкі.

Дык няхай жа заўсёды матылькі звоняць "у струнах сонца залатых"! На радасць усім добрым людзям, а найперш — дзецям.




### АПАЛОН

Гэта было ў студзені, калі мароз — сорак пудоў на воз. Я вяртаўся з рэдакцыі дамоў. На прыпынку ўбачыў афішу: адкрылася выстаўка матылькоў. Перад вачыма тут жа паўстаў сонечны луг, падобны на казачнае царства кветак. Хто адмовіцца перанесціся, хоць на хвілінку, з абрыдлай зімы ў лецейка-лета? Не раздумваючы, я павярнуў да цаглянай будыніны, чамусьці названай Домам прыроды.

У паўзмрочнай зале, акрамя бабулі-наглядчыцы, аніводнай душы. Уздоўж глухіх, без вокан, сцен — вітрыны, асветленыя халодным неонавым святлом. Асцярожна падыходжу бліжэй, з цікаўнасцю нахіляюся...

За пыльным шклом, нібы распяты, нерухома ляжаў вялікі светлы матылёк. На верхніх яго крыльцах былі рассыпаны чорныя плямкі, а на ніжніх — па дзве чырвоныя кропелькі.

Далей глядзець выставу мне расхацелася, бо адчуў сябе саўдзельнікам злачынства. Надта ж балюча зырчэлі з вітрыны славутыя апалонавы кропелькі-крывінкі!

Апалон — прыгажун з прыгажуноў. Невыпадкова яго назвалі ў гонар грэчаскага алімпійскага бога, заступніка музыкаў і паэтаў. А вось у паветры ён маруда. Адчуўшы блізкую небяспеку, спачатку спрабуе ўцячы. Калі не ўдаецца, прыпадае да зямлі і пачынае пагрозліва "шыпець" — шоргае ножкамі спадыспаду па крылах. Магчыма, дробных птахаў гэта і адпуджвае, але не зацятых калекцыянераў. Справа ў тым, што амаль усе апалоны адрозніваюцца паміж сабой малюнкам і адценнем фарбаў, таму няўмольны сачок іх ніколі не абмінаў.

Аксамітна-чорныя, з аранжавымі ланцужкамі па баках вусені апалона надзіва далікатныя істоты. Харчуюцца яны толькі ў сонечнае надвор'е. Любімы іх ласунак — сакавітае лісце ачытка, зайцавай капусты, і больш нічога ім не падавай.

Вучоныя-энтамолагі сцвярджаюць: апалоны даўно з Беларусі зніклі. Аднак я ўпэўнены, што ён абавязкова з'явіцца, калі мы па-сапраўднаму навучымся цаніць і шанаваць Хараство.

## МЁРТВАЯ ГАЛАВА

Калі вясною першымі з'яўяцца белыя матылькі, год выдасца шчодры на малако, а калі жоўтыя — дык на мёд.




Калі ўвесну першым убачыш белага матылька, тады не зведаеш голаду, будзеш есці белы хлеб.

Вядома, не заўсёды збываюцца даўнейшыя народныя прыкметы. Аднак на матылькоў не варта наракаць. Нават самы страшны з адміралавай каманды — мёртвая галава — ні ў чым не вінаваты, хоць на ім і намаляваны чалавечы чэрап з перакрыжаванымі касцямі. Акурат як на жудасным сцягу марскіх разбойнікаў — піратаў.

Між тым мёртвая галава — ніякі не вястун немінучай бяды, як хтосьці можа падумаць. Ну, а не любяць яго хіба толькі пчолы, бо ён аматар паласавацца дармавым мядком. Пралезе ў вулей праз шчылінку лятка і ліпне да свежых сотаў. Пчаліная ахова тут як тут — дружна насядае на няпрошанага госця. Каб дамагчыся свайго, матылёк пагрозліва гудзе. Маўляў, няўжо не бачыце — на мне ж мёртвая галава... Вось дык напалохаў! Пчолы задаюць жару самому таптыгіну, а ўсякую іншую драбязу да смерці зацалоўваюць джаламі.

Пакуль ад знаёмых пчаляроў я пра такія выпадкі не чуў. Яно і не дзіўна: мёртвая галава — вельмі рэдкі начны матылёк, які прылятае ў Беларусь з далёкіх цёплых краёў. Затое ў мяне ёсць выразка з газеты, у якой вось пра што паведамляецца. У прыватным зборы нейкага мінскага калекцыянера знаходзіцца адзіны ў свеце экземпляр мёртвай галавы без малюнка чэрапа і

касцей. Далей сцвярджаецца наступнае: пры неабходнай колькасці нафталіну калекцыя праіснуе ажно 200 гадоў.

Балюча чытаць згаданую публікацыю, дзе гаворыцца пра неабходнасць стварэння ў Беларусі музея насякомых. Бо там няма ніводнага слова пра галоўнае — як нам прыйсці да сапраўднага суладдзя з Жывой Прыродай.

Пакуль яшчэ Жывой…

## ЧАРТАПАЛОХАВІК

Чартапалохавік хоць і названы страшным імем, аднак нікога не палохае. Ні нас, людзей, ні ўсякіх там нячысцікаў. Летам ён сустракаецца ў полі, на няўдобіцах-пустках, дзе растуць чартапалох, бадзяк ды лопухі. Нектар пунсовых суквеццяў гэтых "прыгажуноў" — найлепшы ласунак для насякомых. Адклаўшы на іх лісце яйцы, самкі чартапалохавіка неўзабаве гінуць. Праз тыдзень-другі з'яўляюцца вусені, якія затым ператвараюцца ў шэрыя, з бліскучымі залацінкамі кукалкі. На пачатку восені з кукалак выпырхваюць маладыя матылькі.

У хуткім часе пачынаюцца халодныя дажджы. Не за гарамі суровая матухна-зіма. Большасць птушак адлятаюць у вырай. А ўсякую дробную жамяру чакае нялёгкая зімоўка. Крапіўнік, павінае вока, жалобнік і многія іншыя матылькі хаваюцца ў шчыліны кары старых дрэў, пад стрэхі будынкаў. Аднак і сярод атрада лускакрылых ёсць адчайныя вандроўнікі. Самы вядомы з іх — чартапалохавік. Зірніце на геаграфічную карту і здзівіцеся: як у яго кволых маленькіх крыльцаў хапае сілы, каб адолець тысячы кіламетраў і апынуцца ў Афрыцы? Напрыклад, ажно ў Эфіопіі!

Праз некалькі месяцаў, перачакаўшы на чужыне маразы і мяцеліцы, чартапалохавік зноў вяртаецца на радзіму. Убачыўшы, як ён нетаропка


Чартапалохавік
Чырвонец
Адмірал

пералятае з кветкі на кветку, я адразу ўспамінаю вядомы выраз: "У жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу!"

**ЧЫРВОНЕЦ**

Чырвонец — матылёк-агеньчык.

Быццам іскрынка, ён пырхае над лугавымі кветкамі. Сустракаецца таксама на лясных сцежках і прасеках. Якраз там, дзе ў канцы чэрвеня высыпаюць першыя суніцы. Самыя буйныя і самыя салодкія, падобныя на кропелькі ранішняга сонца. Таму невыпадкова ёсць павер'е , што гэтыя матылькі — гаспадары сунічнікаў.

Заадно хачу вам падказаць, як хутчэй набраць паўнюткае вядзерца ягад. Тут мала толькі ахвоты і цярпення. Напачатку неабходна злавіць хоць аднаго чырвонца. І ніякім не сачком, а найлепш кепкай, знятай з галавы. Злавіць, каб тут жа адпусціць, крыкнуўшы яму наўздагон: "Ляці шчасліва!.."

Аднак не варта вешаць нос, калі вернешся дамоў без ягад і не патрымаўшы ў руках чырвонца. Затое на ўсё астатняе жыццё з табою застанецца незабыўнае. Цудоўны летні дзень. На высокім блакітным небе — белыя ветразі аблокаў. А па сонечнай паляне бяжыць хлапчук. За плячыма ў яго крыламі расхрыстаная кашулька.

Вось так я ўяўляю сабе Краіну Дзяцінства.

# 4

# Пошукі. Адкрыцці. Знаходкі









*Ягор КОНЕЎ, пісьменнік*

# ЯК БЫЛІ ВЫНАЙДЗЕНЫ КАМП'ЮТЭР І ІНТЭРНЕТ



Сёння хіба што глухі не чуў пра камп'ютэры ды Інтэрнет, дзякуючы якому людзі з розных краін і нават кантынентаў могуць зносіцца пасланнямі, быццам сядзяць у розных пакоях адной кватэры.

Што ж гэта такое на самой справе?

Калі былі вынайдзены камп'ютэры і калі з'явіўся Інтэрнет?

У перакладзе з англійскай мовы **"камп'ютэр"** азначае **"вылічальнік"** — прыладу для вылічэнняў.

Чалавецтва здаўна імкнулася да таго, каб навучыцца хуткасна падлічваць. Яшчэ два тысячагоддзі таму ў Старажытным Рыме былі прыдума-




ны лічыльнікі — такія, якімі сёння карыстаюцца на ўроках матэматыкі ў першым класе сярэдняй школы.

У 1642 годзе французскі вучоны Блез Паскаль вынайшаў прыладу, якая механічна складвала лічбы.

А ўжо праз трыццаць гадоў немец Готфрыд Вільгельм Лейбніц сканструяваў **арыфмометр** — прыладу, якая дазваляла механічна выконваць чатыры арыфметычныя дзеянні: суміраваць, вылічаць, памнажаць і падзяляць.

Аднак яшчэ доўгі час **арыфмометр** Лейбніца заставаўся незапатрабаваны грамадствам. Толькі на пачатку XIX стагоддзя, у часы напалеонаўскіх войнаў у Еўропе, **арыфмометры** атрымалі шырокае распаўсюджанне — з іх дапамогай выконвалі складаныя разлікі






балістычных табліц для артылерыйскай стральбы. З'явілася і спецыяльная прафесія — **лічыльнік**. Гэта быў чалавек, які працаваў з **арыфмометрам**. Яго абавязак заключаўся ў тым, каб хутка і дакладна выконваць інструкцыі ў пэўнай паслядоўнасці. Пазней такую паслядоўнасць інструкцый назвалі **праграмай**.

Тым не менш разлікі арыфмометра выконваліся досыць марудна. А ўсё таму, што паслядоўнае выкананне інструкцый і запіс вынікаў рабіў чалавек, а хуткасць чалавечых дзеянняў заўсёды абмежаваная.

У сярэдзіне XIX стагоддзя англійскі матэматык Чарльз Бэбідж паспрабаваў сканструяваць універсальную механічную прыладу — **"Аналітычную машыну"**, якая павінна была вылічваць без удзелу чалавека. Майструючы сваю машыну, Бэбідж прыдумаў **перфакарту** — шчыльную паперу, на якую з дапамогай адтулін наносіцца інфармацыя. З перфакарты, разлічваў Бэбідж, у **"Аналітычную машыну"** будуць уводзіцца праграмы. Прынамсі, праз сто гадоў інфармацыя ўносілася ў першыя камп'ютэры з дапамогай перфакартаў.

Акрамя таго, Бэбідж разлічваў, што **"Аналітычная машына"** будзе мець "склад" для запамінання дадзеных і прамежкавых вынікаў. У сучаснай тэрміналогіі гэты "склад" для






запамінанняў называецца “памяць” камп’ютэра.

На жаль, Чарльз Бэбідж так і не стварыў сваю “Аналітычную машыну”. Прынцып яе дзеяння аказаўся занадта складаным для тагачаснай тэхнікі. Для ажыццяўлення мары Бэбіджа патрабавалася электрамеханічнае рэле, якое было вынайдзена толькі ў XX стагоддзі.

Праз сто гадоў пасля эксперымента Чарльза Бэбіджа, калі тэхнічны ўзровень чалавецтва значна ўдасканаліўся, калі сталі ўжываць электрамеханічнае рэле, навука звярнулася да тэарэтычных распрацовак англійскага матэматыка-дзівака. У 1943 годзе амерыканскі вучоны Говард Эйкен паспяхова выкарыстаў






распрацаваныя Бэбіджам ідэі дый з дапамогай электрамеханічнага рэле стварыў на прадпрыемстве фірмы IBM электравылічальную машыну, якую назваў **"Марк-1"**. Амаль адначасова ў Еўропе аналагічную машыну пабудаваў нямецкі інжынер Конрад Цузе.

Праўда, у адрозненні ад Чарльза Бэбіджа, Говарда Эйкена і Конрада Цузе ніхто не лічыў дзівакамі. Наадварот, іх вынаходкі аказаліся вельмі запатрабаванымі. У той час ужо разгарэлася полымя другой сусветнай вайны. Ваенная прамысловасць мела вострую патрэбу ў аўтаматызаваных вылічальніках, якія можна было ўжываць у балістыцы і крыптаграфіі.

Напрыканцы другой сусветнай вайны амерыканскія вучоныя Джон Мочлі і Праспер Экерт вынайшлі машыну, якая працавала не на рэле, як "Марк-1" Эйкена, а на аснове электронных лямпаў. Сваю вынаходку, якая працавала ў тысячу разоў хутчэй за "Марк-1",




Мочлі і Экерт назвалі "ENIAC". Аднак для таго каб задаць новую праграму "ENIAC" і належным чынам з'яднаць правады, патрабавалася некалькі гадзін і нават дзён.

Каб спрасціць працэс задання праграмы, Мочлі і Экерт узяліся канструяваць новую машыну, здатную захоўваць праграму ў сваёй памяці.

У 1945 годзе да іх працы далучыўся матэматык Джон фон Нэйман. Ён падрыхтаваў даклад пра гэтую машыну і разаслаў яго многім навукоўцам для азнаямлення. У хуткім часе даклад фон Нэймана набыў шырокую папулярнасць у свеце. У ім упершыню былі ясна сфармуляваны асноўныя прынцыпы функцыянавання універсальнай вылічальнай прылады — **камп'ютэра**.

У сваім знакамітым дакладзе фон Нэйман апісаў, як павінен быць зроблены камп'ютэр.

Па-першае, камп'ютэр павінен мець **арыфметычна-лагічную прыладу** — яна ажыццяў-




ляе працэс выканання ўсіх каманд у пэўнай паслядоўнасці.

Па-другое, камп'ютэр павінен мець **прыладу кіравання** (сучасныя клавіятура і "мышка") — яна накіроўвае праграму або на выкананне, або на захаванне.

Па-трэцяе, камп'ютэр павінен мець **прыладу запамінання** — гэта **памяць**, якая можа пашырацца, для захоўвання праграм і шматлікіх дадзеных. Памяць складаецца з пэўнай колькасці пранумараваных ячэек. У кожнай з іх знаходзяцца апрацаваныя дадзеныя або інструкцыі праграм.

І нарэшце, камп'ютэр павінен мець знешнюю **прыладу для ўводу ці вываду інфармацыі** — гэта сучасныя дыскеты або CD-дыскі, а таксама CD-ROM, праз якія інфармацыя з дыска "запампоўваецца" ў памяць камп'ютэра або "выпампоўваецца" з яго.

Прынцып работы камп'ютэра, згодна фон Нэйману, заключаецца ў тым, каб з дапамогай **знешняй прылады** (напрыклад, дыскеты ці дыска) у памяць машыны ўводзілася праграма. **Прылада кіравання** "чытае" змест ячэйкі памяці, дзе знаходзіцца першая інст-

рукцыя (каманда) праграмы, і арганізуе яе выкананне. Такім чынам, **кіраўнічая прылада** выконвае інструкцыі праграмы аўтаматычна, без умяшання чалавека. Яна можа абменьвацца інфармацыяй з **памяццю і знешняй прыладай** камп'ютэра.

**Знешняя прылада** (дыскета ці дыск) звычайна працуе марудней за іншыя часткі камп'ютэра. Таму **кіраўнічая прылада** (клавіятура ці "мышка") можа спыняць выкананне праграмы да завяршэння аперацыі ўводу-вываду са **знешняй прылады**. Напрыклад, гэта здараецца, калі на дыскету памылкова пераводзіцца не тая інфармацыя, што трэба. Усе вынікі выкананай праграмы павінны выводзіцца на экран манітора. Пасля гэтага камп'ютэр чакае наступных сігналаў знешняй прылады.

У 1949 годзе англійскі вучоны Морык Уілксам сканструяваў першы камп'ютэр, у якім увасобіліся ўсе гэтыя



прынцыпы фон Нэймана. З таго часу камп'ютэры значна ўдасканальваліся, але ў асноўных рысах яны і дагэтуль адпавядаюць прынцыпам, сфармуляваным Джонам фон Нэйманам.

Першыя камп'ютэры па памерах былі досыць буйнымі — займалі цэлыя залы. Адпаведна, каштавалі яны дорага. Аднак пасля вынаходніцтва мікрасхемаў і мікраплатаў камп'ютэры значна "падрабнелі" ў памерах, іх кошты зменшыліся. Камп'ютэраў стала значна больш.

Напрыканцы 1960-х гадоў надышоў час злучаць камп'ютэры тэлефоннай сувяззю, надышоў час ствараць камп'ютэрную Сетку, надышоў час Інтэрнету.

Першымі свой унёсак зрабілі амерыканскія вучоныя Льюіс Робертс, супрацоўнік Упраўлення перспектыўных даследаванняў Міністэрства абароны ЗША, і Фрэдэрык Кан, супрацоўнік кампаніі BBN. У 1968 го-



дзе яны наладзілі сувязь праз тэлефонныя правады паміж камп'ютэрамі навукова-даследчых інстытутаў у розных гарадах ЗША.

21 кастрычніка 1969 года з аднаго камп'ютэра ў Каліфарнійскім універсітэце ў Лос-Анжэлесе было адпраўлена паведамленне ў камп'ютэр, які знаходзіўся ў Масачусетскім універсітэце. Першы ліст, адпраўлены па электроннай пошце, складаўся ўсяго з дзвюх літар. Праз пяць секунд пасля адпраўкі ліста камп'ютэр Каліфарнійскага універсітэта "завіс" – сапсаваўся. Аднак у Масачусетскім універсітэце паведамленне атрымалі. Таму 21 кастрычніка 1969 года прынята лічыць днём нараджэння Інтэрнета – "міжнароднай сувязі" ў перакладзе з англійскай мовы.

Таксама Інтэрнет прынята называць з таго часу **Глабальнай Інфармацыйнай Сеткай**. Бо праз тэлефонныя правады, якія сеткай аплятаюць усю планету, з імгненнай хуткасцю перадаюцца камп'ютэрныя паведамленні паміж гарадамі, краінамі і кантынентамі. Штодзень па Інтэрнеце перадаюцца мільёны слоў, малюнкаў, фотаздымкаў. Кантраляваць інфармацыю, якая "перацякае" па Інтэрнеце практычна немагчыма. Інтэрнет не мае цэнтральных пунктаў сувязі, такіх, напрыклад, як тэлефонныя або тэлеграфныя станцыі.

Як ні дзіўна, амаль два дзесяцігоддзі карысць Інтэрнета належным чынам ацэньвалі адно навукоўцы. Камп'ютэрная сувязь была наладжана паміж навуковымі цэнтрамі ў краінах Паўночнай Амерыкі ды Заходняй Еўропы. Інфармацыю з кожнага камп'ютэра можна было за колькі секунд "перапампаваць" у камп'ютэр іншага універсітэта.

І толькі напачатку 1980-х гадоў, калі бізнесмены і фінансісты пераканаліся, што з дапамогай камп'ютэрнай пошты можна імгненна заключаць

здзелкі, купляць і прадаваць, атрымліваць тэрміновую эканамічную інфармацыю, Інтэрнет набыў сусветны попыт. Сёння Глабальная Сетка прыносіць вялікія прыбыткі тым, хто ёй карыстаецца ў фінансавых інтарэсах. Акрамя таго, Інтэрнет дае магчымасць чалавеку, які лянуецца пайсці ў бібліятэку, атрымаць шмат цікавай і каштоўнай інфармацыі праз свой камп'ютэр.

Гэтым і тлумачыцца неймаверная папулярнасць Інтэрнета ў свеце. Таму да яго праз свае камп'ютэры штогод падключаюцца тысячы новых карыстальнікаў. Па прыблізных падліках, сёння ў свеце каля 100 мільёнаў чалавек карыстаюцца паслугамі Інтэрнета. З іх каля 100 тысяч — на Беларусі. А колькі такіх карыстальнікаў будзе праз год ці два — нават уявіць немагчыма.

# 5 Юнаму эрудыту



# ЯК ВЫПРАЦАВАЦЬ ПАХОДКУ?

Аказваецца, зрабіць гэта зусім нескладана. Вы думаеце, чаму ва ўсходніх жанчын паходка лёгкая і прыгожая? Чаму яны высока і горда трымаюць галаву, у іх роўная спіна і лёгкі крок?.. Кажуць, гэта таму, што ўсходнія жанчыны носяць цяжар на галаве. Дарэчы, існуюць спецыяльныя практыкаванні, дзякуючы якім і вы зможаце зрабіць сваю паходку блізкай да ідэальнай.

Станьце спінай да сцяны, уцягніце жывот, рукі апусціце ўздоўж цела. Зафіксуйце гэтае становішча. Некалькі разоў глыбока ўдыхніце паветра. Ця-



пер шыю выцягніце наперад, каб нават валасы не краналіся паверхні сцяны, пакладзіце на галаву цяжкую кнігу. Паспрабуйце зрабіць крок. Атрымалася адразу? Наўрад. Для ўтрымання раўнавагі можна сагнутыя ў локцях рукі крыху развесці ў бакі і павярнуць далонямі ўгору. Так вам будзе значна зручней пераадолець некалькі разоў адлегласць ад сцяны да сцяны.

Цяпер ускладнім заданне: накрэсліце на падлозе дзве лініі (нацягніце дзве паралельныя ніткі) на адлегласці 5 – 7 сантыметраў адна ад адной. Ідзіце дакладна па лініях. Імкніцеся не варушыць рукамі і не падымаць плечы. Галаву трымайце высока. Можна рабіць дыхальныя рухі: чатыры крокі — удых, чатыры — выдых. Паўтараючы гэтае практыкаванне штодня на працягу месяца, вы зможаце выпрацаваць паходку, якой будзеце ганарыцца ўсё сваё жыццё.

## ЯКІ ТВОЙ КОЛЕР?

Колер, які табе да твару, залежыць у асноўным ад колеру тваіх валасоў, вачэй, ад колеру скуры і ад фігуры.

Цёмнавалосыя дзяўчаты са светлай скурай могуць дазволіць сабе любы колер адзення: чырвоны, жоўты, зялёны, аранжавы, бірузовы. Ім да твару і пастэльныя тоны.

Бландзінкі з блакітнымі вачыма не памыляюцца, выбіраючы блакітны і сіні — гэта іх колеры. У любым спалучэнні адценняў яны прыгожа кантрастуюць з колерам іх валасоў.

Блакітны і сіні фон робіць колер вачэй больш насычаным.

Калі ты бландзінка з вельмі светлай скурай твару, не варта выбіраць яркія колеры: на іх фоне ты будзеш выглядаць блякла, затое пастэльныя ко-

леры зробяць тваю знешнасць пяшчотнай і выразнай. Чорнае табе таксама пасуе, але ў раннім юнацтве чорны колер успрымаецца як надта ўрачысты і сур'ёзны, таму не спяшайся — прыйдзе і твой час для такіх строяў. З зялёнай палітры бландзінкам пасуе колер алівы і цёмна-зялёны, а попельным бландзінкам — спалучэнне блакітнага і зялёнага, або колер марской хвалі.

Рыжыя валасы вельмі прыгожыя самі па сабе, і колер адзення павінен падкрэсліваць іх, адцяняць. Такія валасы цудоўна выглядаюць на фоне зялёнага, каштанавага, ружовага.

Лепш за ўсё, калі колер адзення адпавядае колеру вачэй. Упрыгожваць рыжыя валасы лепш чым-небудзь блакітным, светла-шэрым або бэжавым, але не белым: белы колер у валасах падкрэслівае вяснушкі, якія часцяком сустракаюцца ў рыжых.

Для загарэлай скуры лепшымі колерамі з'яўляюцца белы і блакітны, якія, падкрэсліваючы загар, прыцягваюць увагу да твару.

Калі люстэрка сказала табе пад сакрэтам, што ты крыху таўставатая, пазбягай яркіх колераў: яны толькі падкрэсліваюць паўнату. У залежнасці ад таго, дзе ты хочаш прыхаваць лішняе, апранай або цёмныя спадніцы, або цёмныя блузкі. Поўным дзяўчатам, хочаш не хочаш, даводзіцца нагул адмаўляцца ад светлых колераў адзення.

Мода на колеры мяняецца кожны сезон. Калі ты ўпрыгожыш адзенне моднага колеру разнастайнымі дэталямі (упрыгожаннямі, поясам, хусцінкай, гальштукам, каўнерыкам) "твайго" тону, то яно ніколі не будзе аднастайным.

# ЯК ПРАВІЛЬНА ВЫБРАЦЬ КАСМЕТЫКУ?

Вельмі часта ў анатацыях да розных касметычных сродкаў робіцца прыпіска “Для сухой (тлустай, нармальнай) скуры”.

Тып скуры вызначаецца па дзвюх прыкметах: колькасці вады, якая знаходзіцца ў яе клетках, і колькасці тлушчу, што выдзяляецца ёю. Адрозніваюць сухую, нармальную, тлустую і змешаную скуру.

**Нармальная** — гладкая, чыстая, аксамітная, не пераборлівая да надвор’я. Калі прыкласці кавалачак скотча да пераносіцы і прылеглых участкаў шчок, то на ім застанецца лёгкі след. Праверыць скуру можна такім жа спосабам і з дапамогай папяроснай паперы.



**Сухая скура** — пяшчотная, тонкая, матавая, лёгка раздражняецца і лушчыцца. Рэагуе на змены складу вады. На папяроснай паперы не пакідае ніякага следу, а на скотчы будуць заўважаны белыя лускавінкі.

**Тлустая скура** — тоўстая, бліскучая, з вялікімі порамі. На папяроснай паперы пакідае заўважны тлусты след, а на скотчы будуць відаць як быццам кропелькі вільгаці.

**Сухая на шчоках і тлустая на носе скура называецца змешанай.** Такі тып скуры часцей за ўсё сустракаецца ў падлеткавым узросце.

# 6

# Парады дамавічка



# ПАСПРАБУЙЦЕ СЯБЕ Ў ГРАФАЛОГІІ

*(Псіхалагічны тэст)*

Графалогія — даволі цікаўная і займальная навука. Гэта навука пра почырк. Па почырку можна шмат даведацца пра свой характар, а таксама пра характар іншых людзей. Дзеля таго каб атрымаўся праўдзівы, ёсць адно пажаданне. Чалавек, якога вы папрасілі напісаць некалькі сказаў на чыстым аркушы паперы, не павінен здагадвацца, што вы яго тэсціруеце.

Кожная характэрная рыса ці асаблівасць пісьма адзначаецца пэўнай колькасцю балаў, потым гэтыя балы складаюцца ў агульную суму. Калі вынікі тэсту для вас аказаліся нечаканыя ці несуцяшальныя — не сумуйце! Памятайце: перад вамі ж гульня.

Характарыстыкі

**Памер літар:**

вельмі маленькія — 3 балы
маленькія — 7 балаў
сярэднія — 17 балаў
буйныя — 20 балаў

**Нахіл літар:**

нахіл налева — 2 балы
лёгкі нахіл налева — 5 балаў
нахіл направа — 14 балаў
рэзкі нахіл направа — 6 балаў
простае напісанне — 10 балаў

**Форма літар:**

круглыя — 9 балаў
бясформенныя — 10 балаў
вуглаватыя — 19 балаў



**Напрамак почырку:**

радкі "паўзуць" угору — 16 балаў
радкі простыя — 12 балаў
радкі "спаўзаюць" уніз — 1 бал

**Сіла націску:**

лёгкая — 8 балаў
сярэдняя — 15 балаў
вельмі моцная — 21 бал

**Характар напісання слоў:**

схільнасць да злучэння літар у слове — 11 балаў
схільнасць да асобнага напісання літар — 18 балаў
змешаны стыль — 15 балаў

**Агульная ацэнка:**

почырк акуратны — 13 балаў
почырк няроўны — 9 балаў
почырк неразборлівы — 4 балы

Вынікі:

38—51 — такі почырк назіраецца ў тых, каму за 80 гадоў або ў людзей са слабым здароўем.

52—63 балы — так звычайна пішуць людзі нясмелыя, флегматычныя, пасіўныя.

64—75 балаў — гэткі почырк належыць людзям нерашучым, даверлівым, але не без пачуцця ўласнай годнасці.

76—87 балаў — такі почырк, хутчэй за ўсё, належыць людзям уражлівым, таварыскім, звычайна добрым сямейнікам.

88—98 балаў — тыя, хто дасягнулі гэтых балаў, вызначаюцца чэснасцю, адважнасцю, рашучасцю, моцнай ўстойлівай псіхікай.

99—109 балаў — гэтая сума балаў належыць індывідуалістам. Яны ўспыльчывыя, незалежныя ў сваіх думках і дзеяннях і разам з тым крыўдлівыя, з няпростымі адносінамі ў калектыве. Сярод такіх людзей нямала асоб, схільных да творчай працы.

110—121 балаў — такі почырк характэрны людзям без пачуцця адказнасці, недысцыплінаваным і нецярплівым.

# ЦІ ЎМЕЕШ ТЫ ПАДМАНВАЦЬ?

*(Псіхалагічны тэст)*

Ці бываюць у цябе час ад часу такія думкі, якія ты ніколі нікому не выказваеш?
— так (10),
— не (2),
— не магу адказаць адназначна (6).

Ці захоўваеш чужыя сакрэты, калі цябе пра гэта просяць?
— так (6),
— не (10),
— бывае па-рознаму (2).

Ці ўмееш захоўваць спакой, чакаючы важных падзей, важных паведамленняў (напрыклад, выезд за мяжу, прыём на работу)?
— так (2),
— не (10),
— залежыць ад многіх абставін (6).

Ці здараецца, што ты часам не можаш разабрацца ў бягучых падзеях, збіты з панталыку тым, што расказалі пра гэта іншыя?
— так (2),
— не (6),
— не ведаю (10).

Ці ўмееш, калі патрэбна, устрымацца ад таго, каб не сказаць праўду ў вочы?
— так (2),
— не (10),
— бывае па-рознаму (6).

Калі знаходзіш важкія аргументы ў спрэчцы, ці здараецца паўтарыць іх некалькі разоў?
— так (10),
— не (6),
— не магу адказаць (2).

Ты ведаеш, што хтосьці падманвае. Што робіш? Не рэагуеш, робіш выгляд, што ўсё ў парадку, быццам бы верыш таму, хто гаворыць.
— так (10),
— не (6),
— залежыць ад сітуацыі, справы, асобы і г. д. (2).

Ці ўмееш валодаць сваёй мімікай (грымасы, іранічныя ўсмешкі)?

— так (10),
— не (6),
— не ведаю (2).

Ці здараецца табе ў думках жадаць камусьці ўсяго найгоршага?
— так (10),
— не (6),
— не ведаю (2).

Ці лічыш, што цябе любяць іншыя?
— так (2),
— не (6),
— не магу адказаць (10).

Вынікі:

20 – 46 балаў. Умееш лавіраваць і робіш гэта дасканала. Калі патрэбна — падманваеш, як па масле. Калі пераконваешся, што гэта сябе не апраўдвае, ні на крок не адступаеш ад праўды і робіш гэта так, каб усе бачылі. Умееш маскіравацца, рабіць выгляд, што клапоцішся не пра сябе, а галоўным чынам пра справу. Цябе паважаюць, бо амаль заўсёды ты даволі проста дасягаеш раней пастаўленай мэты.

48 – 76 балаў. Асабліва не дбаеш пра пільнасць. Калі табе ўдаецца падмануць, то і добра. Калі хтосьці выкрые падман — для цябе нічога страшнага не адбылося — звычайны выпадак. Галоўнае, каб дабіцца поспеху, захаваць свой інтарэс. Пра справядлівасць асабліва не задумваешся. Па тваім меркаванні, усе дарогі, якія вядуць да мэты, добрыя.

78 – 100 балаў. Падман даецца табе цяжка. Не любіш і не ўмееш гэтага рабіць. Нават калі такое ўдаецца, гэта цябе хутчэй здзіўляе, чым прыносіць табе маральнае задавальненне. Калі вымушаны разміна[ц]ца з праўдай, гэта прыносіць табе мара[л]ьныя пакуты, стараешся хутка пра гэта забыцца альбо выдумваеш спосабы кампенсацыі страт, якія, на тваю думку, панеслі асобы, якіх табе ўдалося ашукаць. Не здольны да вострых дыскусій, бо хутка падпарадкоўваешся чужым аргументам, забываючыся пра сваё.

# ЦІ ВАРТА ПОМСЦІЦЬ?

Многіх з нас неаднойчы ў жыцці крыўдзілі. І часам з'яўляецца жаданне адпомсціць крыўдзіцелям. Здаецца, што помста прынясе моцнае задавальненне. Але пасля вы пераконваецеся ў тым, што памыліліся — задавальнення амаль не адчуваецца. Затое ўзаемная варожасць пераходзіць на новы віток, і за гэтай крыўдай узнікаюць новыя і новыя.

Уяўная "салодкасць помсты" ставіць кожнага перад выбарам — або своечасова стрымаць помслівыя памкненні, або дазволіць ім запанаваць над сваім розумам.

Кожны зразумее вашу прагу адпомсціць крыўдзіцелю. Але важна, каб гэтае жаданне было накіравана не на шкоду, а на карысць вам. Першае пытанне, на якое вы павінны адказаць, калі будзеце прагнуць помсты, — як далёка вы гатовы пайсці, каб "звесці рахункі" з ворагам?

Калі вы, мсціўца, у выніку дзеянняў атрымліваеце шкоды не менш за ворага, значыць, эмоцыі запанавалі над вашай свядомасцю.

Збіраючыся помсціць, не забывайце, што вынікам гэтага будзе шмат дарэмна страчанага часу. Прыгадваючы зноў і зноў, як вас пакрыўдзілі, ды малюючы шматлікія карціны будучай помсты, вы нават не заўважыце, як некалькі гадзін знікне ў пустату.

Памыляюцца тыя, хто спадзяецца, што помста пазбавіць ворага ўплыву на ваша далейшае жыццё. Наадварот. Калі прага помсты ператвараецца ў неадчэпную ідэю, атрымліваецца, што вораг набывае яшчэ большую духоўную ўладу над вашымі ўчынкамі.

Такім чынам, лепш адмовіцца ад непрадуктыўных відаў помсты, якія не прынясуць вам ніякай карысці. Паспрабуйце накіраваць сваю энергію ў іншае рэчышча. Няхай ваша

асабістая помста ператворыцца ў жаданне пераўзысці дасягненні ворага, даказаць усім, што вы больш спрытны, хітры, разумны і таленавіты.

Часам менавіта старая крыўда робіцца выдатным стымулам да развіцця чалавека ў лепшы бок, яго маральнага, духоўнага і фізічнага ўдасканалення.

Вядома, такое жаданне нельга назваць помстай у традыцыйным разуменні гэтага слова, але менавіта да яго варта імкнуцца.

## І ГЭТА ЎСЁ — ПРА ВОЦАТ

Воцат выкарыстоўваюць для прыгатавання некаторых страў, каб надаць ім вастрыню. Але ён таксама добры памочнік у хатняй гаспадарцы.

Некалькі кропель воцату, дабаўленыя ў салату адразу ж пасля прыгатавання, захаваюць у ёй вітамін С.

Бульба ў мундзірах не разварыцца, калі ў ваду дадаць некалькі кропель воцату.

У тушаную свежую капусту дадайце крыху воцату, каб яна не была вельмі мяккай.

Анучка, змочаная ў воцаце і пакладзеная на накрыўку каструлі, убярэ ў сябе непрыемны пах капусты.

Пах цыбулі, рыбы, часнаку, квашанай капусты або селядца знікне, калі посуд мыць з дабаўленнем у ваду воцату.

Перш чым пакласці ў цеста соду, развядзіце яе ў лыжцы воцату. Пах соды ў пірагу не будзе адчувацца.

У цвёрдай вадзе цяжка прамыць валасы. А калі вы дадаеце ў ваду 1 – 2 лыжкі воцату, валасы стануць мяккімі і набудуць прыгожы бляск.

Сукенку з чорнай шарсцяной тканіны пасля мыцця прапалашчыце ў вадзе з воцатам (2 – 3 лыжкі на вядро вады) — гэта асвяжыць яе колер.

Дзіцячыя пялёнкі не будуць мець спецыфічнага паху, калі пасля паласкання вы патрымаеце іх некалькі хвілін у халоднай вадзе, дадаўшы ў яе крыху воцату.

Чамадан, якім вы доўгі час карысталіся, набыў непрыемны, гнілы пах. Пратрыце яго ўнутры анучкай, змочанай у воцаце, а затым добра прасушыце, пажадана на сонцы.

Афарбоўка тканіны, мэблі, дываноў стане ярчэйшай, калі выбіваць іх праз анучу, змочаную растворам 1 сталовай лыжкі воцату і 1 л вады.

Каб пазбавіцца ад чарнільнай плямы на адзенні, запэцканае месца некалькі разоў апусціце ў гарачы воцат да поўнага растварэння чарніла, а потым памыйце ў мыльнай вадзе і прапалашчыце.

## КАЛІ НЕ БЫЛО ХАЛАДЗІЛЬНІКАЎ

Як нашы продкі захоўвалі прадукты, калі яшчэ не было такога прывычнага для нас прадмета інтэр'ера кухні, як халадзільнік?

Яйкі захоўвалі ў солі, пілаванні, саломе або пяску. Іх таксама кансервавалі, заліваючы вапнавым растворам або змазваючы шкарлупіну кожнага яйка тлушчам. Пры захоўванні яйкі ўкладвалі вострым канцом уніз.

Масла выдатна захоўвалася, калі яго прамывалі ў салёнай вадзе і шчыльна набівалі ў гаршчок. Затым у глыбокую талерку або тазік налівалі халодную ваду і ставілі туды гаршчок дагары дном. Ваду часта мянялі.

Мяса, напрыклад, цяляціну, белае мяса свойскай птушкі, трусяціну, залівалі сыраквашай або сыроваткай. Летам яго перакладвалі лістамі крапівы або хрэну. Свініну трымалі 3 – 6 дзён у расоле, а бараніну, дзічыну ці ялавічыну — у воцатнай заправе. Для працягла-

га захоўвання мяса клалі ў слоікі, якія герметычна закрываліся, і пастэрызавалі тройчы кожныя 24 гадзіны.

З гэтымі старымі спосабамі варта пазнаёміцца, таму што іншы раз яны могуць прыдасца і зараз.

## ЕЖА НАШЫХ ПРОДКАЎ

Характар ежы і харчавання беларусаў вызначаўся накіраванасцю іх гаспадаркі. Старажытныя славяне былі пераважна земляробамі, таму раслінная ежа для беларусаў спрадвечная. Значнае месца ў харчаванні займалі дзікарослыя расліны (шчаўе, цыбуля лугавая, часнок палявы, баршчавік, крапіва, лебяда), ягады, грыбы.

Асноўныя спосабы захоўвання прадуктаў — сушэнне, квашэнне; пазней — капцілі. Найбольш пашыраны від раслінай ежы да нашага часу — каша. Яе варылі з абтоўчанага цэлага ці з сечанага зерня (круп) і молатага (мукі). Кашу з цэлага зерня ячменю, радзей пшаніцы, — куццю, груцу, гушчу, — гатуюць і ў наш час, пераважна як абрадавыя (на куццю, радзіны, памінкі, Дзяды). Крупяную кашу — традыцыйную ежу беларусаў — варылі галоўным чынам з проса і аўса, ячных і грэцкіх круп, гатавалі з малаком, мясам, салам, каўбасой. Рэдкія мучныя цестападобныя стравы калісьці былі асноўнай ежай у пост і да нядаўняга часу шырока бытавалі на Беларусі. Паводле спосабу прыгатавання адрозніваліся квашаныя (кваша, саладуха, кулага), няквашаныя (калатуша, кулеш, саламаха, лямешка) і з соладу (саладуха, путра). З аўсянай мукі гатавалі кісель, жур, талакно. Былі шырока вядомы рэдкія мучныя стравы — зацірка, галушкі. Традыцыйная ежа беларусаў (як і іншых славян) — бліны з жытняй, пшанічнай, грэцкай, ра-

дзей ячнай мукі. Каштоўным і шанаваным прадуктам з мукі быў хлеб (жытні, пшанічны), яго пяклі з рознымі дабаўкамі — бульбай, буракамі, у галодныя гады — з жалудамі, мякінай. Як не было хлеба, на снеданне раніцай пяклі пры агні скавароднік (з хлебнага цеста, якое яшчэ не падышло), або праснак, корж (з прэснага цеста, часам замешанага на сыроватцы). Святочнае печыва — пірагі — звычайна рабілі з пшанічнай мукі.

З XVIII стагоддзя ў харчаванні беларусаў вялікае месца займае бульба, якая стала штодзённай сялянскай ежай. З бульбы гатавалі розныя стравы, яна ішла як дабаўка да мучных і агароднінных. Бульбу варылі цэлую і рэзаную, чышчаную і ў лупінах, пяклі, смажылі. З дранай бульбы пяклі і пякуць дранікі і бабку, з тоўчанай робяць камы, з пакрышанай — булён. Бульба ідзе на прыгатаванне клёцак, калдуноў, запяканак, піражкоў. Налічваюць звыш 200 страў з бульбы, таму і называюць яе на Беларусі другім хлебам.

З малочных прадуктаў спажывалі малако, тварог, сыр, масла, смятану, сыроватку, маслёнку (скалоцвіны), малодзіва. Малако елі халодным, гатаваным, але пераважна кіслым. На сыроватцы рабілі халаднік, варылі крупнік, пяклі бліны. Смятану спажываюць як закрасу для баршчу, квас да бліноў і г.д.

Значна меншае месца ў харчаванні беларусаў займалі мясныя стравы. Спажывалі свіное мяса, бараніну, мяса свойскіх птушак, значна радзей — мяса кароў, цялят (ёсць сведчанні, што ў старажытнасці мяса валоў не елі). Мяса спажывалі сырым, вараным, печаным, вэнджаным. Найбольш пашыраная страва з сырога мяккага свінога мяса — каўбаса. Мяса захоўвалі таксама ў свіным страўніку (коўбіку). Сала елі сырым, печаным (скваркі); тукам і здорам закрашвалі стравы, унутраны тлушчператоп-

лівалі. Са свіных вантробаў рабілі вантрабянку (сальцісон), з крыві — крывянку, варылі юху, боршч. З ног, галавы гатавалі квашаніну. У той дзень, калі калолі кабана, гаспадары наладжвалі са свежыны багатую вячэру, якую называлі свежынай, пагалоўшчынай ці верашчакай.

У наш час ежа беларусаў стала больш разнастайнай: з'явіліся новыя прадукты харчавання, сталі шырока ўжывацца стравы іншых народаў. Аднак многія беларускія нацыянальныя стравы па-ранейшаму карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў краіне і вядомы за яе межамі.



# ЗМЕСТ


## СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

*Анатоль Бутэвіч*

Слава і няслаўе Крэўскага замка .................. 4
Зваблівая маладосць 500-гадовага замка ......... 52

## ВІДАВОЧНАЕ – НЕВЕРАГОДНАЕ

*Яраслаў Пархута*

Самае глыбокае ........................................ 71

## З ЧЫРВОНАЙ КНІГІ БЕЛАРУСІ

*Уладзімір Ягоўдзік*

Адмірал і яго каманда ................................ 84

## ПОШУКІ. АДКРЫЦЦІ. ЗНАХОДКІ

*Ягор Конеў*

Як былі вынайдзены камп'ютэр і Інтэрнет...... 98

## ЮНАМУ ЭРУДЫТУ

*Па старонках друку*

Як выпрацаваць паходку? ............................ 110
Які твой колер? ......................................... 111
Як правільна выбраць касметыку? ................ 112

## ПАРАДЫ ДАМАВІЧКА

Паспрабуйце сябе ў графалогіі ..................... 115
Ці ўмееш ты падманваць? ............................ 118
Ці варта помсціць? .................................... 120
І гэта ўсё — пра воцат ............................... 121
Калі не было халадзільнікаў ......................... 122
Ежа нашых продкаў .................................... 123

**Эўрыка:** Нарысы: Для сярэд. шк. узросту / Уклад.
Э 94 Н. В. Філіповіч; Маст. Т. Я. Кудзіна і інш. — Мн.: Маст. літ., 2002. — 126 с.: іл. — (Гісторыя, адкрыцці, знаходкі, парады).

ISBN 985-02-0582-2.

Новы выпуск штогодніка "Эўрыка" складаюць ужо знаёмыя чытачу раздзелы "Старонкі гісторыі", "Відавочнае — неверагоднае", "З Чырвонай кнігі Беларусі", "Пошукі. Адкрыцці. Знаходкі", "Юнаму эрудыту","Парады дамавічка".

**УДК 087.5:082**
**ББК 72**

Навукова-папулярнае
выданне

**ЭЎРЫКА**

**Нарысы**

Укладальнік
*ФІЛІПОВІЧ Наталія Васільеўна*

Рэдактар *Н. В. Філіповіч*
Мастацкі рэдактар *В. А. Макаранка*
Тэхнічны рэдактар *Т. С. Звярковіч*
Карэктары *М. Ч. Пермякова, Д. Р. Лосік*
Камп'ютэрны набор і вёрстка *Л. І. Астрэйкі*

Падпісана да друку з арыгінала-макета 04.12.2002. Фармат 70x84 $^1/_{16}$.
Папера афсетная. Гарнітура Кудрашоўская. Афсетны друк.
Умоўн. друк. арк. 8,72. Улік.-выд. арк. 6,5. Тыраж 3000 экз. Заказ 530.

Выдавецкае рэспубліканскае
унітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Ліцэнзія ЛВ № 3 ад 11.09.2000.
220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
"Мінская фабрыка каляровага друку".
220024, Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.





ISBN 985-02-0582-2
9 789850 205827 >



Эврика